

НОВЫЯ ТАРЫФЫ НА ПАСЛУГІ ЖКГ
6

ПРЫВІДЫ МІРСКАГА ЗАМКА
13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 СТУДЗЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 4 (29373)

# Сімвал зімы і дружнай сям'і



У вёсцы Рачэнь Любанскага раёна жыве шматдзетная сям'я РУДЗЬКО — дружная і працавітая, у якой гадуюцца дзеці Марыя, Міхаіл, Дар'я і Святлана. Калі надыходзяць выхадныя дні альбо святы, уся сям'я збіраецца разам. Дзеці прывучаны дапамагаць бацькам у гаспадарскіх справах, бацькі з задавальненнем удзельнічаюць у дзіцячых гульнях і віктарынах. Калі, нарэшце, выпаў снег, галава сям'і Юрый Аляксандравіч дапамагаў дзецям ляпіць прыгожага і вялікага снегавіка — сімвал сапраўднай зімы і дружнай сям'і. Мне выпадкова пашанцавала ўбачыць гэтую сям'ю разам каля калектыўнага «снежнага твора». Спадзяюся, нашы чытачы таксама належным чынам ацэняць працу сямейнага калектыву.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей ДЗЕРМАНТ, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, палітычны аналітык:**

*«Думаю, што 2021-ы, аб'яўлены Годам народнага адзінства, так ці інакш будзе ўжо іншы па настроі. Упэўнены, што кансалідацыя грамадства пачнецца, і мы адчуем сябе адзіным грамадствам, а не расколатым. Думаю, усе разумеюць, што нас гэта ўмацуе. А ў сучасным свеце лепш быць у стане агульнага кансэнсусу, чым раздраю».*

## КОРАТКА

- Беларускія мытнікі ў 2020 годзе спынілі 85 спроб незаконнага ўвозу транспартных сродкаў.
- **Выстаўка «Белагра-2021» пройдзе ў Мінску 1—5 чэрвеня.**
- Тэставы перыяд па зніжаных тарыфах у роўмінгу паміж РФ і Беларуссю працягнулі да канца 2021 года.
- **Беларусы ў 2020 годзе купілі валюты на $1,97 млрд больш, чым прадалі.**
- Кітайская кампанія ўпершыню закупіла рапсавы алей на БУТБ.
- **У Івацэвіцкім раёне ўзялі пад ахову месца росту лілеі кучаравістай.**



- У Мінску з пачатку снегападаў вывезена 36,7 тыс. куб. м снегу.
- **Усе лясгасы Беларусі падключыліся да электроннай сістэмы ўліку драўніны.**

ISSN 1990 — 763X

Год малой радзімы: вынікі

## ГОМЕЛЬШЧЫНА — ТЭРЫТОРЫЯ БЯЗМЕЖНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**У Гомельскай вобласці падвялі вынікі трылогіі Года малой радзімы. Ці атрымалася стымуляваць сацыяльна-эканамічнае развіццё ў рэгіёне? Што зроблена для павышэння якасці жыцця людзей? Якое значэнне набылі мясцовыя ініцыятывы жыхароў вобласці? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў старшыня Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Генадзь САЛАВЕЙ.**



СТАР. 4-5

Постаці

## УЛАДЗІМІР МУЛЯВІН: СЭРЦА, ДУМЫ І ЛЕГЕНДЫ... ЯК З'ЯЎЛЯЛІСЯ ЯГОНЫЯ ПЕСНІ

**«Песняра» прымусілі перад прэм'ерай перарабіць фінал оперы «Песня пра долю» на мажорны**



СТАР. 8–9

# «Здолее Міжнародная федэрацыя ўстаяць супраць ціску, значыць, мы правядзём чэмпіянат»

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

### Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з кіраўніком Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазелем

***«Па-першае, Рэнэ, я хачу пажадаць табе моцнага здароўя. Напэўна, ва ўсім свеце гэта актуальна па вядомых прычынах»***, — вітаў госця кіраўнік дзяржавы.

***Датычна тэмы сустрэчы — запланаванага сёлета на тэрыторыі Беларусі і Латвіі чэмпіянату свету па хакеі — беларускі лідар заўважыў, што яна стала не менш вострай.***

***«Як прэзідэнта Федэрацыі і асабістага сябра Беларусі хачу цябе запэўніць, што ніякай небяспекі ні па якіх пытаннях у Беларусі няма і не будзе,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***Ні па каранавірусе, ні з пункту гледжання палітычнай або фізічнай бяспекі людзей, якія жывуць тут і якія прыязджаюць да нас як госці»***.

Тыя, хто пратэстуе або незадаволены нечым у Беларусі, не штурмуюць уладныя ўстановы, звярнуў увагу Прэзідэнт краіны.

***«У нас цалкам нармальная абстаноўка з пункту гледжання развіцця дэмакратычных працэсаў***, — дадаў ён. — ***І гэта — галоўная прычына незадаволенасці асобных палітыкаў у Еўропе Беларуссю. Мяне хочуць абвінаваціць у тым, што я абараняю сваю краіну і сваіх людзей. Але мяне для гэтага абралі. І я абавязаны забяспечыць унутраную і знешнюю бяспеку сваіх людзей і сваёй дзяржавы. Ну, магчыма, мае дзеянні ў сувязі з гэтым некаму на Захадзе не падабаюцца, але гэта іх права»***.

Калі казаць пра падрыхтоўку да чэмпіянату свету, то ўсё, што Прэзідэнт Беларусі абяцаў кіраўніку Міжнароднай федэрацыі хакея, ён выканаў, запэўніў беларускі лідар.

***«Мы гатовыя правесці чэмпіянат свету ў любы час»***, — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў пытанне пра тое, як ён ставіцца да таго, што адбываецца вакол гэтай тэмы: «Скажу шчыра: вельмі спакойна. Здолее Міжнародная федэрацыя хакея ўстаяць супраць несправядлівага ціску, значыць, мы правядзём чэмпіянат свету. Калі Латвія адмовіцца, ты цудоўна ведаеш: у Беларусі мы правядзём чэмпіянат свету. І гэта будзе найлепшы чэмпіянат свету ў гісторыі». Калі Федэрацыя не справіцца з ціскам асобных палітычных колаў некаторых краін, тады сёлета чэмпіянату свету не будзе ў Беларусі, дадаў лідар краіны. ***«Усё залежыць зараз ад вас»***, — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі пагадзіўся са словамі Рэнэ Фазеля пра тое, што спорт павінен аб'ядноўваць народы, а не раз'ядноўваць, і ён павінен быць, наколькі гэта магчыма, па-за палітыкай.

***«У гэтым ключы мы будзем дзейнічаць»***, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

***«Сітуацыя сёлета некалькі адрозніваецца ад той, што была ў 2014 годзе,*** — адказаў кіраўнік Міжнароднай федэрацыі хакея. — ***Вы памятаеце, што ў 2014 годзе таксама быў ціск, але мы прыехалі і разам арганізавалі цудоўны чэмпіянат»***.

На кіраўніцтва Федэрацыі апошнім часам аказваецца вельмі моцны ціск, прызнаўся Рэнэ Фазель.

***«Але ў нас дакладная пазіцыя. Як вы сказалі, мы не хочам змешваць спорт і палітыку. І спорт павінен аб'ядноўваць народы, а не раз'ядноўваць»***, — дадаў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «Новае пакаленне прыходзіць, яны павінны ўзяць на сябе ў найбліжэйшы час адказнасць за будучыню краіны»

**У мінулую нядзелю на тэлеканале «Расія» ў вячэрнім прайм-тайме выйшаў у эфір чарговы выпуск перадачы «Дзеючыя асобы». Асабліва чаканы ён быў беларускімі гледачамі. За некалькі дзён да эфіру анансавалася — галоўным героем аўтарскай перадачы журналісткі Наілі Аскер-задэ будзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і ўбачаць яго ў нязвыклых для лідара краіны абставінах. Размаўляў з журналісткай Аляксандр Лукашэнка за рулём прэзідэнцкага «мерседэса», падчас хакейнай трэніроўкі ў «Алімпік Арэне», у сваім рабочым кабінеце і ў матчыным доме за бясёдным сталом. «Звязда» нагадвае самыя цікавыя вытрымкі з размовы.**

## ІНТЭГРАЦЫЯ З РАСІЯЙ

«Перш чым куды-небудзь рухацца, трэба вырашыць прынцыпова адно пытанне. Адно. Стварыць роўныя ўмовы для людзей і суб'ектаў гаспадарання. Гэта прапісана ва ўсіх дакументах і ў дамове. Калі будуць роўныя ўмовы, мы можам значна і хутка рушыць наперад. Але пакуль няма роўных умоў, і гэта вялікі-вялікі недахоп у нашым саюзным будаўніцтве», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пра кошт газу для Беларусі ў 128,5 долара ЗША за 1 тысячу кубаметраў ён адзначыў, што пры сённяшніх адносінах з Расіяй цана магла б быць «больш справядлівай».

## РЭФЕРЭНДУМ І КАНСТЫТУЦЫЯ

Папраўкі ў Асноўны закон краіны, са слоў Аляксандра Лукашэнкі, будуць уносіцца выключна на рэферэндуме. Яго дату мяркуюць аб'явіць на Усебеларускім народным сходзе. «Думаю, на працягу года мы зможам распрацаваць праект новай Канстытуцыі. І думаю, што да канца года праект новай Канстытуцыі будзе гатовы. І тады на рэферэндуме людзі вызначаць, быць новай Канстытуцыі або не быць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## НЕПРЫЗНАННЕ ВЫБАРАЎ ЗАХАДАМ

«Мы выбары праводзілі, як і Расія, дарэчы, як і любая іншая дзяржава (праводзіць выбары для сябе, а не ва ўгоду тым ці іншым краінам. — **«Зв.»**), для Беларусі. Гэта наша ўнутраная справа. Ну, а на Захадзе густы розныя ёсць, нехта прызнае, хтосьці не прызнае, ну — гэта справа густу. Вядома, не вельмі гэта прыемна, калі шчыра, але ўжо так, каб гэта мяне забівала, — абсалютна не», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

## ПРА СУСТРЭЧУ Ў СІЗА

«Вы не шкадуеце, што пайшлі на сустрэчу са зняволенымі апазіцыянерамі? Навошта вам гэта было?» — запытала рэпарцёр.

«Я ўбачыў людзей (мяне ў Расіі да гэтага часу падштурхоўваюць — давайце з апазіцыяй, асабліва ваша ліберальнае крыло). Ну, вось я і пагаварыў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Я ўбачыў людзей, якія хацелі быць ва ўладзе, імкнуліся прыйсці да ўлады. Я іх выслухаў. Я зразумеў, якая была б Беларусь, калі б яны прыйшлі да ўлады. Ну і многае-многае іншае. Я тым самым прадэманстраваў, што мы можам весці дыялог з кім заўгодна, калі гэтага хто-небудзь хоча».

## ПРА ПАЛІТЫЧНЫЯ РАЗМОВЫ Ў СЯМ'І

Падчас вячэры ў доме, дзе жыла маці Аляксандра Лукашэнкі, да размовы далучыўся малодшы сын Прэзідэнта Мікалай.

«Палітыку дома абмяркоўваеце?» — задала яму пытанне Наіля Аскер-задэ.

«А што яшчэ абмяркоўваць дома...» — адказаў сын Прэзідэнта.

«А бывае, што Мікалай кажа: «Тата ты не маеш рацыі»?» — удакладніла карэспандэнт.

«Так, кожны дзень па некалькі разоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але гэта не робіць мяне апазіцыянерам», — дадаў юнак.

На каментарыі сына, як адзначыў Прэзідэнт, ён рэагуе па-рознаму: «Часам — ідзі і не лезь, а так — правым бокам мозга — разумею, што ён не проста мае права на свой пункт гледжання, а ён разбіраецца, у чымсьці мае рацыю, асабліва вось цяпер».

«Я ніколі не буду маўчаць, заўсёды лепш выказаць свой пункт гледжання. Ён гэта пачуе. Пры іншых людзях я ніколі не скажу, што ён не мае рацыі», — звярнуў увагу Мікалай Лукашэнка.

## ПРА ПРЭЗІДЭНЦКАЕ АСЯРОДДЗЕ І КРЫЗІС

Наіля Аскер-задэ запытала: ці ёсць у асяроддзі кіраўніка краіны людзі, здольныя ўплываць на яго рашэнні?

«Вельмі шмат людзей, якія могуць паўплываць ці паўдзельнічаць у фарміраванні майго рашэння. Але калі ўжо я прыняў рашэнне, я яго буду вельмі жорстка адстойваць і праводзіць у жыццё», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ужо адказваючы на пытанне пра палітычны крызіс, ён адзначыў, што такі крызіс у Беларусі пасля кожных выбараў: «Ён звязаны з палітыкай, але ў аснове ляжыць — заўсёды ў аснове адзін са стаўпоў, калі можна так выказацца — эканоміка. Калі ў нас будзе нармальна эканоміка развівацца, хоць бы як сёлета, нам ні будучы, ні 23-і, 25-ы гады не страшныя».

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што ў будучыні, калі будуць казаць пра эпоху Лукашэнкі, то яе вызначаць як эпоху стабільнасці, міру і справядлівасці.

## ПРА ЗАКАНЧЭННЕ РАБОТЫ

«Я ўжо не так востра ўспрымаю тое, што калісьці прыйдзецца завяршаць. Раней гэта востра ўспрымаў, а цяпер — не», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

«І што будзеце рабіць? Як Абама, мемуары пісаць?» — пацікавілася журналістка.

«Не, напэўна, я не для гэтага, каб пісаць мемуары. Хоць вельмі шмат цікавага можна было б напісаць. Я буду, напэўна, адпачываць. Калі трэба — буду дапамагаць, каб захаваць кавалачак гэтай зямлі для дзяцей. Новае пакаленне прыходзіць, яны павінны ўзяць на сябе ў найбліжэйшы час адказнасць за будучыню краіны», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Падрыхтавала Марыя ДАДАЛКА.**

# РОСТ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў учора з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Віктара Шэймана, перадае карэспандэнт БелТА.**

Віктар Шэйман далажыў Прэзідэнту аб выніках работы прадпрыемстваў сістэмы Кіраўніцтва справамі ў 2020 годзе, вынікі паказаны ндрэнныя. У прыватнасці, выручка ад рэалізацыі прадукцыі склала Br2,6 млрд (рост больш як на 140 працэнтаў). Добра спрацавалі сельская гаспадарка, прамысловасць, будаўніцтва — ва ўсіх галінах выраслі аб'ёмы вытворчасці. Больш сціплыя вынікі ў сувязі з пандэміяй паказалі гасцінічная справа, турыстычная галіна, грамадскае харчаванне.

Што датычыцца гандлю, дадатнае сальда склала каля $150 млн.

Закранаючы супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента, Віктар Шэйман далажыў аб заключэнні кантракта на пастаўку тэхнікі ў гэты рэгіён і аб прапрацоўцы наступнага дагавора. Акрамя таго, прапрацоўваецца пытанне будаўніцтва трактарнага завода ў адной з афрыканскіх краін.

У час сустрэчы Аляксандр Лукашэнка і Віктар Шэйман таксама абмеркавалі падрыхтоўку да будучага Усебеларускага народнага сходу і новыя кірункі работы.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіраўнік ААН параўнаў бягучы год з 1945-м



«Мы перажываем момант — як у 1945 годзе. Сённяшняя вайна вядзецца супраць мікраскапічнага віруса. Заўтрашняя можа пачацца супраць тэрарыстаў у кіберпрасторы», — заўважыў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, выступаючы па відэасувязі на ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды 75-годдзя першага сходу Генеральнай Асамблеі арганізацыі. Ён падкрэсліў, што пандэмія аказала моцнае ўздзеянне на бедных, пажылых і дзяцей, людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Шэраг развітых дзяржаў ігнаруе правы і патрэбы менш развітых краін у забеспячэнні насельніцтва вакцынай ад каранавіруса. Пандэмія «ўвяла ў галечу каля 88 мільёнаў чалавек і паставіла больш за 270 млн чалавек пад пагрозу вострага недахопу харчавання, яна агаліла слабыя месцы нашага свету», — канстатаваў Антоніу Гутэрыш.

## Сусветны крыптарынак абваліўся больш чым на $220 млрд



Агульная капіталізацыя рынку крыптавалют знізілася ў параўнанні з пікавым значэннем напярэдадні. Калі на піку 10 студзеня рынак ацэньваўся ў $1,117 трлн, то ўчора на мінімуме — толькі ў $896,6 млрд. Асноўным драйверам стаў біткоін, на які прыпадае больш за дзве трэці ўсяго рынку крыптавалют. Пасля ўзлёту да амаль $42 тысяч ён дэманструе найбольш значнае падзенне з сакавіка. Другая найбуйнейшая крыптавалюта Ethereum таксама ўпала — на 18 працэнтаў. Распродаж пасля крутога ралі можа азначаць, што частка інвестараў вырашыла зафіксаваць прыбытак, выказаў здагадку CNBC. Але біткоін вядомы сваімі «шалёнымі» скачкамі кошту, дадаў тэлеканал. «Трэба яшчэ зразумець, ці пачатак гэта больш значнай карэкцыі», — заявіў агенцтву Bloomberg кіраўнік аддзела развіцця бізнесу крыптавалютнай біржы Luno ў Сінгапуры Віджай Аяр.




Слова — удзельнікам

# «У ТРАДЫЦЫЯХ НАРОДНАГА ВЕЧА»

— Праводзіць Усебеларускія сходы — добрая традыцыя, якая склалася за гады існавання суверэннай Беларусі, — адзначыў **Аляксандр ДЗЯДЗІНКІН, дырэктар Віцебскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.** — І ў гэтым ёсць вельмі станоўчы эфект, разам з тым, што працуе парламент і іншыя інстытуты грамадзянскай супольнасці. Традыцыя каранямі ідзе ў эпоху вечавога ладу. Здаўна, з часоў старажытнай Русі склалася традыцыя: збірацца ўсёй грамадой у важныя часы і вызначаць, куды, можна сказаць, рушыць далей, прымаць адказныя для ўсіх рашэнні.



Так і цяпер адказны перыяд. Таму прадстаўнікі народа збяруцца і абмяркуюць важнае. Для мяне галоўнае, каб Беларусь захавала незалежнасць. Лічу, што гэты сход вызначыць не толькі перспектывы на найбліжэйшую пяцігодку, але і акрэсліць тэндэнцыі развіцця краіны і грамадства як мінімум на дваццаць гадоў. Гэта ў першую чаргу звязана з магчымай неабходнасцю канстытуцыйнай рэформы. А яна можа прадугледжваць змены ў выбарчай сістэме.

Пытанні партыйнага будаўніцтва, магчыма, будуць абмяркоўвацца. Для мяне гэта як для члена Кампартыі вельмі важна. А як дырэктару філіяла вучэбнай установы мне хацелася б пачуць з вуснаў кіраўніка дзяржавы, можа, падчас дыскусіі па тэме адукацыі наконт таго, якая будзе чарговая прыёмная кампанія. Ад яе ж залежыць лёс любой ВНУ. Вельмі актуальнае пытанне — працаўладкаванне выпускнікоў. Напрыклад, мы прафсаюзны ўніверсітэт, юрыдычна недзяржаўнай формы ўласнасці. Чаму б не абмеркаваць, каб і нашы выпускнікі маглі б атрымліваць накіраванні на работу, як і іх равеснікі, якія скончылі дзяржаўныя альма-матар на бюджэтных умовах. Гэтыя пытанні цікавяць і бацькоў нашых юнакоў і дзяўчат. Вельмі актуальныя і пытанні навучэння, яго набліжэння да практыкі. Канешне, мы імкнёмся працаваць у гэтым кірунку. Але, можа, трэба яшчэ больш павялічыць колькасць вучэбных гадзін не ў аўдыторыях, а па-за імі? Каб, напрыклад, будучыя юрысты маглі напрацоўваць навыкі ў пракуратуры, або Следчым камітэце, настаўнікі — каб больш бывалі ў школах і гэтак далей. Хочацца пачуць пра гэта.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Цэны

# ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**Міністэрства па падатках і зборах інфармуе, што з першых дзён студзеня падняліся стаўкі падатку на дабаўленую вартасць на ўвоз некаторых тавараў — лекаў, медыцынскіх вырабаў, харчовых і дзіцячых тавараў.**

Да новых партый тавараў будуць прымяняць ужо абноўленыя стаўкі ПДВ. А да 1 лютага аптэкі і гандаль павінны перагледзець цэны ў рознічнай сетцы на рэштку з улікам уключэння ў іх ПДВ па новых правілах. Гэтыя нованаўвядзенні прадугледжаны абноўленым Падатковым кодэксам, растлумачылі рэдакцыі ў Галоўным упраўленні развіцця падатковых органаў Міністэрства па падатках і зборах краіны.

Такім чынам, раней, да 2021 года, лекі і медыцынскія вырабы, у тым ліку пратэзна-артапедычныя, якія ўвозілі ў Беларусь, вызваляліся ад ПДВ. А з гэтага года стаўку падатку для іх вызначылі на ўзроўні 10 %. У спісе пазіцый, на якія раней пры ўвозе ў краіну дзейнічаў «нулявы» падатак, былі ў тым ліку актываваны вугаль, вата, вазелін, спіртавыя настойкі, харчовыя прадукты, тлушчы з печані рыбы, альбуміны, дэзынфікуючыя сродкі, сродкі для гігіены рота і зубоў, лінзы і апараты для ачкоў, растворы для захоўвання кантактных лінзаў, тальк.

Спіс лекаў і медыцынскіх вырабаў, на якія не налічваўся ПДВ, вялікі. Сярод іншага падымуць падатак і на дыягнастычныя або лабараторныя рэагенты, сертыфікаваныя эталонныя матэрыялы. Гэта значыць, існуе верагоднасць, што могуць падаражэць платныя аналізы і абследаванні.

У Міністэрстве фінансаў растлумачылі, што стаўкі ПДВ на лекі паднялі «для іх упарадкавання ў першую чаргу з Расійскай Федэрацыяй». У нас цяпер стаўкі па ПДВ на лекі аднолькавыя, а раней у Беларусі былі больш льготныя.

«Але па факце гэта не давала больш нізкай цаны на лекі. Таму што плаціць пры іх увозе нічога не трэба было — ні ПДВ, ні мытныя пошліны. Адпаведна, і кантроль за гэтай цаной быў больш «мяккі». Цяпер цэны ў аптэках пракантралююць адпаведныя службы — Міністэрства аховы здароўя і МАРГ. На думку спецыялістаў міністэрства, гэтыя ведамствы не дапусцяць неабгрунтаванага росту цэн.

З першых дзён года паднялі ПДВ на харчовыя і дзіцячыя тавары, якія ўвозяцца ў Беларусь, — з 10 % да 20 %. Пры гэтым на некаторыя тавары, як дзіцячыя, так і прадукты харчавання, гэты падатак па-ранейшаму будзе на ўзроўні 10 %. З харчовых тавараў такая (мінімальная) стаўка цяпер прымяняецца да сацыяльна значных. А з дзіцячых тавараў стаўка ў 10 %, як планавалася, застанецца на тыя вырабы, якія ўваходзяць у склад спажывецкага кошыка для сям'і з чатырох чалавек.

Напрыклад, стаўка ПДВ у 10 % сярод іншага засталася на мяса і харчовыя мясныя субпрадукты, малако і малочную прадукцыю, рыбу (уключаючы філе і іншае мяса рыбы) — жывую, свежую, астуджаную, маражаную), рэпчатую цыбулю, сланечнікавы алей, таматы, рапсавы алей, гатовыя прадукты з мяса (акрамя далікатэсаў), хлеб, макароны. На гэтыя тавары цэны праз ПДВ не вырастуць. Але трэба ўлічваць, што дзяржава ўстанаўлівае для сацыяльна значных тавараў мяжу па росце цэн.

Што да дзіцячых тавараў, ПДВ не павышаецца, напрыклад, на дзіцячыя пялёнкі і падгузкі, школьныя ранцы, партфелі, заплечнікі, школьныя дзённікі, сшыткі, некаторыя курткі, касцюмы, камплекты, пінжакі, штаны, камбінезоны, курткі, вятроўкі, воданепранікальны абутак з падэшвай і з верхам з гумы або пластмасы.

Пасля 1 лютага могуць падаражэць прывязныя настольныя і пакаёвыя дзіцячыя гульні, дзіцячыя санкі, пластылін для лепкі, пеналы, вокладкі для падручнікаў, альбомы для малявання. Адсутнічае ў пераліку льготнага падаткаабкладання і істотны спіс дзіцячага адзення. Цяпер у ім няма, напрыклад, такіх пазіцый, як галаўныя ўборы, пальчаткі, рукавіцы, калготкі і панчохі.

Азнаёміцца са спісам харчовых і дзіцячых тавараў, на якія распаўсюджваецца стаўка ПДВ у 10 %, можна на 118—120-й старонках абноўленага Падатковага кодэкса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# ДА КАНЦА ТЫДНЯ ПАДМАРОЗІЦЬ НЕ ПА-ДЗІЦЯЧЫ

## Да мінус 20—25 градусаў чакаецца ў нас ужо ў гэтую суботу

**Калі ў мінулым годзе снегу ў нас амаль не было, то сёлета з пачатку студзеня белае покрыва ахінула «па вушы». А ўслед за добрым снегам прыйдзе і арктычны холад, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Вышыня снежнага покрыва, паводле звестак на раніцу 11 студзеня, складае ад 1 да 26 сантыметраў, самыя высокія гурбы (30 см) адзначаны на метэастанцыі «Барысаў». І ў далейшым атмасферныя франты ад паўночнаатлантычных цыклонаў будуць фарміраваць ападкі ў выглядзе снегу. У сувязі з распаўсюджваннем халодных паветраных мас з паўночных шырот істотна пахаладае, асабліва 15—17 студзеня, калі ў асобных раёнах па паўночным усходзе краіны ўначы паветра можа астудзіцца да 20—25 градусаў марозу.

А пакуль атрымліваем асалоду ад умераных маразоў і мяккага снегу. Сёння ўдзень месцамі па краіне пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, паўднёвы ўмераны, удзень па захадзе парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла. Камфортная (не занадта халодная) зіма чакае нас і ў сераду. Часам будзе ісці снег, слабая мяцеліца. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Вецер будзе паўднёва-ўсходні, паўднёвы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

Лёгкае дыханне Арктыкі мы адчуем ужо ў чацвер. У гэты дзень, 14 студзеня, часам будзе ісці снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 7—13 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах — ад мінус 3 да мінус 6 градусаў. У начныя гадзіны пераважна па паўночным усходзе месцамі да 14—15 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу на большай частцы Беларусі прагназуюцца кароткачасовы снег, слабая завіруха. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 11—18 марозу, уначы ў асобных раёнах — да мінус 21, па паўднёвым захадзе — 9—10 градусаў ніжэй за нуль.

Калі ў мінулыя гады нам здавалася, што мінус 20 — гэта «максімум» маразоў ад сівабародага дзеда, то ў гэты сезон усё па-іншаму. Паводле разлікаў спецыялістаў, другая дэкада студзеня прагназуецца халаднейшая, чым звычайна, на 1—3 градусы (пры норме мінус 3—6 градусаў). Таму ўжо ў суботу будзе яшчэ халадней. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег, на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—21 марозу, у асобных раёнах — мінус 22—25 градусаў. Удзень холад таксама будзе «кусаць за вушы» — 11—18 градусаў ніжэй за нуль, па паўднёвым захадзе — мінус 9—10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Аркадзя Уладзіміравіча РУСЕЦКАГА, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Тарыфы

# Падатковыя стаўкі на арэнду жылля падраслі

**З першых дзён новага года для тых падаткаплацельшчыкаў, якія здаюць у арэнду кватэры, дачы, гаражы і парковачныя месцы, павысілі стаўкі падаходнага падатку. Акрамя таго, у сталіцы і абласных цэнтрах з гэтага года адмянілі эканоміка-планіровачныя зоны. Цяпер сума падатку будзе аднолькава, у якой частцы горада б ні здаваліся кватэра або гараж. Змяненні прадугледжаны прынятым новым Падатковым кодэксам нашай краіны.**

Напрыклад, у Мінску летась было пяць эканоміка-планіровачных зон, стаўкі складалі ад 18,5 рубля (за пятую) да 32,5 рубля (за першую). А цяпер, з 1 студзеня 2021 года, устанавілі адну стаўку ў горадзе — 34,3 рубля за здачу ў наём аднаго пакоя ў жылым памяшканні. Гэта значыць, што для тых, хто здае кватэру ў цэнтры, стаўка падатку павялічылася, але няпначна. А вось для тых, хто здае жыллё ў той частцы сталіцы, якая раней адносілася да 5-й эканоміка-планіровачнай зоны, стаўка падатку вырасла даволі істотна.

Гэта ж датычыцца і рэгіёнаў. Так, у Віцебску было тры эканоміка-планіровачныя зоны, а падатак за здачу аднаго жылога памяшкання складаў ад 25 да 27 рублёў. У Гомелі быў падзел на дзве зоны — і 29,2 рубля і 30,2 рубля адпаведна. Падобная градацыя па зонах была і ў іншых абласных цэнтрах. Дык вось, цяпер з першых дзён студзеня для ўсіх абласных гарадоў устанавілі аднолькавую стаўку — 32,5 рубля за здачу ў арэнду кожнага жылога пакоя ў асобным жылым памяшканні (садовым доміку або дачы).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Факт

# ТРЭНД ЧАСУ — НАВАГОДНІЯ ДРЭВЫ Ў КАДКАХ

**Міністэрства лясной гаспадаркі падвяло вынікі рэалізацыі навагодніх дрэў у 2020 годзе. Напярэдадні зімовых свят беларусы купілі больш за 133 тысячы калючых прыгажунь, у тым ліку — звыш трох тысяч навагодніх дрэў у кадках (елак, соснаў, піхтаў).**

Найбольш актыўна жывыя атрыбуты свята ў гэтым годзе купілі жыхары Мінскай і Гродзенскай абласцей — тут рэалізавана больш за 30 і 27,5 тысячы дрэў адпаведна. Пры гэтым прыкметна вырас попыт на навагоднія дрэвы ў кадках і навагоднія букеты — за пераднавагодні перыяд па ўсёй краіне было прададзена 3 159 і 3 702 адзінкі адпаведна.

У міністэрстве адзначылі, што найбольш актыўна грамадзяне набывалі вечназялёныя дрэўцы ў апошнія дні 2020 года. Толькі ў перыяд з 28 да 31 снежня па ўсёй краіне было рэалізавана больш за 46 тысяч дрэў.

У Мінлясгасе нагадалі, што напярэдадні навагодніх свят лесагаспадарчыя ўстановы арганізавалі гандаль больш чым на 1,1 тысячы гандлёвых пунктах. Ёлачныя кірмашы працавалі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Таксама па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі адбылася рэспубліканская акцыя «Захавай сімвал свята». Яна ахапіла ўсе населеныя пункты з колькасцю насельніцтва больш як 30 тысяч чалавек. Лесагаспадарчыя ўстановы прапаноўвалі ўсім ахвотным набыць навагоднія дрэвы ў кадках, захаваць іх да вясны (напрыклад, на балконе альбо на дачы) і высадзіць іх у найбліжэйшым лясніцтве падчас акцыі «Тыдзень лесу», якая традыцыйна праходзіць вясной. Пры гэтым кожнаму пакупніку была ўручана памятка па доглядзе за навагоднім дрэвам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ГОМЕЛЬШЧЫНА— БЯЗМЕЖНЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Генадзь Міхайлавіч, вядома, аснова любой справы — чалавек, а развіццё рэгіёна — работа гаспадарчага комплексу і канкурэнтаздольная эканоміка — непасрэдна залежаць ад кваліфікаваных кадраў. Якія меры прымаюцца ў Гомельскай вобласці, каб стымуляваць дзелавую актыўнасць насельніцтва?***

— За 2018—2020 гады на Гомельшчыне створана каля дзвюх тысяч малых і сярэдніх арганізацый. Больш за 570 з іх — у сельскіх населеных пунктах і малых гарадах. За гэты перыяд амаль 12 тысяч грамадзян зарэгістравалася ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Безумоўна, камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці ў рамках рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» гэтаму спрыялі. Добры вынік прынесла актыўная інфармацыйная работа. На інтэрнэт-сайтах, у сацсетках, праз СМІ і інфармацыйныя сустрэчы жыхары рэгіёна даведаліся, якія дзяржава дае прэферэнцыі для развіцця прадпрымальніцтва.

***— Навесці парадак на зямлі, добраўпарадкаваць населеныя пункты, палепшыць якасць жыцця людзей — ключавыя задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам. Што зроблена ў гэтым кірунку?***

— У 2018 годзе эпіцэнтрам маштабных пераўтварэнняў стаў адзін з аддаленых раённых цэнтраў Гомельшчыны, пацярпелы ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС — Брагін, а таксама першы беларускі населены пункт, вызвалены ад нямецкіх захопнікаў восенню 1943 года — гарадскі пасёлак Камарын. Па рашэнні Гомельскага аблвыканкама яны былі ўключаны ў праграму комплекснага добраўпарадкавання тэрыторыі. На тэрыторыі Брагінскага раёна абнавілі больш за сто аб'ектаў. Былі праведзены капітальныя рамонты будынка дзіцячай школы мастацтваў у Брагіне і гарадскога Дома культуры ў Камарыне, выканана рэканструкцыя раённага Дома культуры і былога будынка ДТСААФ пад спартыўна-аздараўленчы цэнтр са спартыўнай залай.

У 2019 годзе новае аблічча атрымаў Петрыкаў. Даручэнне прывесці горад на Прыпяці ў ідэальны стан, як і ў цэлым Палескі рэгіён, было дадзена Прэзідэнтам Беларусі. У райцэнтры аднавілі ўсе аб'екты медыцыны, адукацыі, культуры, спорту і камунальнай гаспадаркі. Былі праведзены маштабная замена ўсіх камунікацый, капітальны рамонт жыллёвага фонду і добраўпарадкаванне гарадскіх вуліц, галоўнай плошчы і цэнтральнага гарадскога парку, выкананы работы па рэканструкцыі атэля і стадыёна, а таксама іншых знакавых аб'ектаў горада. Варта згадаць і рэканструкцыю ў 2018 годзе моста праз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне. Збудаванне мае стратэгічнае значэнне для Турава, дзе размешчаны, напрыклад, малочны і кансервавы камбінаты. Для месцічаў гэты мост — адзіны спосаб дабрацца ў раённы цэнтр з аддаленых населеных пунктаў.




Адкрыццё паліклінічнага комплексу ў 17-м мікраёне з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***— Нельга не звярнуць увагу на тое, наколькі паспяхова рэалізуецца комплексны план паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця аднаго з самых буйных раёнаў Гомельскай вобласці — Мазыршчыны...***

— Так, два гады запар Мазырскі раён заносіцца на Рэспубліканскую дошку Гонару — гэта высокая адзнака, дадзеная Прэзідэнтам і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Перад раёнам пастаўлена задача — шукаць пункты далейшага росту эканамічнага патэнцыялу. У прыярытэце — павышэнне ўзроўню жыцця людзей, іх дабрабыт і камфортныя ўмовы для ўсіх катэгорый грамадзян. Мазырскі раён — лідар у рэгіёне па наяўнасці градаўтваральных прадпрыемстваў, якія вядомыя не толькі на Гомельшчыне і ва ўсёй Беларусі, але і за мяжой. Яны ахопліваюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі: нафтаперапрацоўку, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, солі, машын і абсталявання, кабеляў, швейных вырабаў.

***— Жамчужына Прыпяцкага Палесся — Мазыршчына — летась стала цэнтрам правядзення «Дажынак» у Гомельскай вобласці. Раскажыце, што зроблена ў раённым цэнтры да свята працаўнікоў вёскі?***

— Безумоўна, летась Мазыршчына перажывала сапраўдны будаўнічы бум. У раённым цэнтры правялі капітальны рамонт і рэканструкцыю вулічна-дарожнай сеткі, замену водаправодных і каналізацыйных сетак, капітальны і бягучы рамонт жыллёвага фонду. Быў уведзены шэраг сацыяльна значных аб'ектаў, завяршэння якіх жыхары раёна чакалі з нецярпеннем.

Хачу звярнуць увагу, што летась пасля маштабнай рэканструкцыі адкрыты Мазырскі драматычны тэатр імя Івана Мележа. Установа цяпер па праве можа прэтэндаваць на статус выбітнага культурнага цэнтра не толькі Мазыра, але і ўсяго Прыпяцкага Палесся. Цяжка пераацаніць значэнне новага аб'екта аховы здароўя — міжраённага кардыялагічнага цэнтра, які адкрыты ў 2019 годзе на базе Мазырскай цэнтральнай гарадской бальніцы. У зоне яго абслугоўвання, апрача Мазырскага, — Нараўлянскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Ельскі і Хойніцкі раёны. А гэта каля 300 тысяч чалавек, якім неабходна дапамога спецыялістаў у лячэнні і прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў.



Першая ўрачыстая лінейка ў новай сярэдняй школе № 74.

***— Генадзь Міхайлавіч, што яшчэ значнае ў сацыяльнай сферы з'явілася на Гомельшчыне апошнім часам?***

— Прапаную працягнуць гаворку аб развіцці сферы аховы здароўя на Гомельшчыне, бо гэты кірунак асабліва актуальны для нашага рэгіёна, які пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС. Так, у 2018 годзе рэалізаваны найбуйнейшы праект па рэканструкцыі Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Яго ажыццяўленне знаходзілася пад патранатам кіраўніка дзяржавы. Пасля маштабнай мадэрнізацыі ўстанова аховы здароўя аказвае дапамогу маленькім пацыентам на якасна новым узроўні.

Летась з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 17-м мікараёне Гомеля здадзены ў эксплуатацыю сучасны паліклінічны комплекс. Ён не мае аналагаў сярод арганізацый аховы здароўя першаснага звяна ва ўсёй краіне, разлічаны на абслугоўванне 40 тысяч чалавек.

Летась пасля маштабнага капрамонту адкрыты лячэбны корпус Гомельскай абласной сухотнай клінічнай бальніцы. У ім размясціліся тры пульманалагічныя аддзяленні з сістэмай кіслародазабеспячэння, якая выконвае адну з ключавых роляў у працэсе лячэння пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй. Гэта вельмі важна ва ўмовах пандэміі.

Акрамя таго, летась у Добрушы адкрыліся абноўленыя акушэрска-гінекалагічнае і цэнтралізаванае стэрылізацыйнае аддзяленні раённай бальніцы. З бюджэту выдаткавана 715 тысяч рублёў. Больш чым 1/3 гэтых сродкаў накіравана на медыцынскае і тэхналагічнае абсталяванне для аддзяленняў, астатнія грошы — на іх капітальнае абнаўленне. У аграгарадках Церахоўка і Карма Добрушскага раёна часткова мадэрнізавалі медыцынскія аб'екты.

***— Якія значныя вытворчыя аб'екты нядаўна з'явіліся на Гомельшчыне?***

— Гэта новая малочнатаварная ферма саўгаса-камбіната «Зара» ў аграгарадку Завайць Нараўлянскага раёна. Яе, дарэчы, падчас візіту на Гомельшчыну наведаў Прэзідэнт краіны. Новая вытворчасць раз-

**Адкрыццё ў 2020 годзе новых пелетных вытворчасцяў на Гомельшчыне — сапраўды значны этап эканамічнага развіцця не толькі рэгіёна, але і краіны ў цэлым. Так, пяць тон каштоўнага біяпалiва ў гадзіну выпускае новы пелетны завад у Мазыры. Ён быў узведзены летась у рэкордныя тэрміны. Магутнасць прадпрыемства — 36 тысяч тон прадукцыі ў год. Гэта адзін з самых маштабных праектаў у лясной галіне, які рэалізоўваўся апошнім часам. Вытворчая магутнасць завода — каля 120 тон прадукцыі ў суткі. Прынамсі, першы ў сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі пелетны завод адкрыўся 12 гадоў таму таксама менавіта на Гомельшчыне, у Жыткавіцкім раёне. У 2020 годзе ў раёне адкрыта новая вытворчасць па выпуску паліўных пелет. Гэта высокатэхналагічны завод магутнасцю 20 тысяч тон у год. У праект прыцягнута інвестыцый на суму больш за 5,1 мільёна еўра. Штосутачна тут выпрацоўваюць 20 тон паліўных гранул, якія прыносяць даход у 50 тысяч еўра ў месяц.**



Мост праз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне.

# ТЭРЫТОРЫЯ МАГЧЫМАСЦЯЎ



Адкрыццё Мазырскага драматычнага тэатра імя І. Мележа.

лічана на 550 галоў дойных кароў і 700 галоў маладняку. На фінансаванне праекта выдаткаваны ў тым ліку сродкі, накіраваныя на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Акрамя таго, у Мазырскім раёне саўгасам-камбінатам «Зара» адкрыта новае сельгаспрадпрыемства па вырошчванні бацькоўскага статку кур-бройлераў. На тэрыторыі новай фермы пяць птушнікаў. Магутнасць — пяць мільёнаў яек у год.

Выканана даручэнне Прэзідэнта — павялічыць магутнасці па вытворчасці мяса птушкі за кошт мадэрнізацыі існуючых вытворчасцяў. Так, у аграгарадку Камунар Буда-Кашалёўскага раёна пасля маштабнай рэканструкцыі адкрыты цэх «Беларуснафта-Асобіна» па атрыманні мяса птушкі. Новая вытворчасць — гэта чатыры птушнікі, у якіх адначасова можна вырошчваць каля 50 тысяч бройлераў, а гэта амаль удвая больш, чым раней. Праект рэалізаваны па дзяржпраграме развіцця аграрнага бізнесу ў Беларусі на 2016—2020 гады. Аб'ём інвестыцый склаў 6,4 мільёна рублёў.

***— Генадзь Міхайлавіч, выходзіць, нават складаны 2020 год дазволіў Гомельшчыне завяршыць будаўніцтва шэрагу спартыўных аб'ектаў, устаноў адукацыі і культуры...***

— Сапраўды, лічу вельмі важным, што гэты навучальны год падарыў маленькім жыхарам Гомельшчыны шанц пайсці ў новыя школы, дзіцячыя садкі, займацца ў гуртках і секцыях новых дамоў культуры і спартыўных комплексаў. Так, летась пасля капітальнага рамонту адкрыты Палац культуры ў аграгарадку Камунар Буда-Кашалёўскага раёна. Уведзены ў эксплуатацыю будынак гісторыка-краязнаўчага музея ў Жлобіне. У курортнай зоне — пасёлку Чонкі Гомельскага раёна — адкрыты новы дзіцячы яслі-сад «Вясёлкаград». Упершыню прагучаў званок у новай школе ў мікрараёне № 21 Гомеля. А ў самым вялікім сельскім населеным пункце Кармянскага раёна — аграгарадку Ліцвінавічы — звыш 130 дзяцей зноў селі за парты ў адноўленай падчас маштабнай рэканструкцыі школе.

Між тым, толькі за апошнія два гады ў Гомелі адкрыліся тры дзіцячыя садкі ў Навабеліцкім раёне, басейн, шматфункцыянальны спартыўны комплекс, лыжаролерная траса. У пачатку 2020 года адкрыты першы крыты футбольны манеж, пабудаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы за кошт сродкаў абласнога бюджэту і Беларускай федэрацыі футбола.

У Мазыры напярэдадні аграфестывалю «Дажынкі-2020» адсвяткавалі наваселлі адразу некалькі сацыяльна значных аб'ектаў. Так, новы ўтульны будынак атрымаў Мазырскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі. Уваходзіны таксама адзначылі ў спартыўным комплексе спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2 Мазыра.

Варта адзначыць, што летась пачалося будаўніцтва ўнікальнай для Гомельшчыны ўстановы адукацыі. Гэта школа ў 96-м мікрараёне абласнога цэнтра, аналагаў якой па многіх параметрах няма на тэрыторыі рэгіёна.

***— На гады, прысвечаныя малой радзіме, прыйшлося святкаванне 75-годдзя вызвалення Беларусі і Вялікай Перамогі, а таксама 75-я гадавіна вызвалення Гомельскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Рэалізацыя сапраўды народнага праекта — мемарыяльнага комплексу «Ала», якая праходзіла пад вашым кіраўніцтвам, паказала, як можна развіваць патрыятычны турызм у рэгіёне...***

— Для цяперашняга пакалення беларусаў важна захаваць памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, абаронцах Радзімы. Лічу, што ў апошнія гады гэты кірунак атрымаў вельмі важны імпульс. 21 чэрвеня 2020 года ў Светлагорскім раёне з удзелам Прэзідэнта краіны ўрачыста адкрыты мемарыяльны комплекс на месцы спаленай вёскі Ала. У студзені 1944 года тут былі забітыя 1758 чалавек, з іх 950 — дзеці. Гэта ў 12 разоў больш людскіх ахвяр, чым ва ўсім вядомай Хатыні. Свой унёсак ва ўвекавечанне гэтага месца памяці на Светлагоршчыне ўнеслі ўсе беларусы, бо на будаўніцтва аб'екта была накіравана значная частка сродкаў ад рэспубліканскага суботніка.

***— Мінулыя тры гады многія называлі самым душэўным аспектам развіцця тэрыторый, абвешчаным на дзяржаўным узроўні. Гэта час для кожнага, незалежна ад пасады і звання, сацыяльнага становішча і дастатку зрабіць штосьці значнае для роднага населенага пункта. Якое значэнне набыла рэалізацыя мясцовых ініцыятыў жыхароў рэгіёна?***

— Ініцыятывы толькі падтрымліваюцца! А спрацоўваюць яны найлепш, калі ёсць сумесная работа — людзей, улад, актывістаў грамадскіх арганізацый і, безумоўна, пры падтрымцы рэальнага сектара эканомікі. Лічу, што сур'ёзны вопыт назапашаны ў гэтым плане ў Гомелі. Сіламі жыхароў дэпутацкага корпуса, членаў таварыстваў уласнікаў за асабістыя сродкі і з прыцягненнем спонсарскай дапамогі ў абласным цэнтры добраўпарадкаваныя дваровыя тэрыторыі, з'явіліся новыя гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі. У рэгіёне таксама ёсць выдатныя прыклады. Так, жыхар вёскі Краснае Гомельскага раёна самастойна абсталяваў спартыўную пляцоўку для пляжнага валейбола, якой у летні перыяд актыўна карыстаюцца як дзеці, так і дарослыя. Ураджэнцы аграгарадка Неглюбка Веткаўскага раёна ўладкавалі міні-пляцоўку для футбола і закупілі спортінвентар для дзяцей. Жыхары Ельскага раёна за апошнія тры гады рэалізавалі больш за дзесяць мясцовых ініцыятыў. Ініцыятыўная група на Жлобіншчыне пры падтрымцы райвыканкама і мясцовых прадпрыемстваў распрацавала тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне па ўстаноўцы комплексу вулічных агульнадаступных спартыўных збудаванняў. Як вынік, на тэрыторыі Цэнтра алімпійскага рэзерву ў Жлобіне ўстаноўлена сучаснаеваркаўт-абсталяванне, у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Між тым, сёння вельмі важна, каб у кожным раёне і нават у кожным населеным пункце быў свой буйны іміджавы праект, які адлюстроўвае мясцовыя асаблівасці і каларыт рэгіёна. Новае дыханне ў гады малой радзімы атрымалі яркія іміджавыя праекты ў сельскіх населеных пунктах Гомельшчыны. Вялікай папулярнасцю ў краіне і за яе межамі карыстаюцца нашы фестывалі «Кліч Палесся», «Берагіня», «Аўцюкі».

Адзначу, што вялікую ролю ў праведзенай рабоце адыграла інфармацыйная падтрымка СМІ. За мінулы перыяд у рэгіянальных электронных і друкаваных выданнях выйшаў шэраг матэрыялаў, прысвечаных Году малой радзімы. Лічу, што толькі агульнымі намаганнямі атрымліваецца замацоўваць пазітыўны імідж рэгіёна, як тэрыторыі для вядзення бізнесу, пабудовы сям'і і выхавання дзяцей. Бо сапраўды Гомельшчына — тэрыторыя бязмежных магчымасцяў.

**Гутарыла Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**



Абноўленыя аддзяленні Добрушскай цэнтральнай раённай бальніцы.

**Тэхнапарк «Карал» у Гомелі — унікальны для Беларусі вопыт па стварэнні суб'екта інавацыйнай дзейнасці пры задзейнічанні свабоднай эканамічнай зоны. Галоўная ідэя праекта — паляпшэнне ўмоў для дзейнасці інавацыйных прадпрыемстваў, вытворчасці запатрабаваных на сучасным рынку тавараў і паслуг, умацаванне партнёрскіх адносін паміж органамі ўлады, прадстаўнікамі навукі, бізнесу і адукацыі. Стварэнне тэхнапарка ўключыла рэканструкцыю вытворчых памяшканняў і адміністрацыйна-бытавых карпусоў, што ўваходзілі ў склад былога завода «Карал». Праект і асноўную частку будаўніча-мантажных работ выканалі гомельскія архітэктары і будаўнікі. У тэхнапарку прадугледжаны зоны з розным функцыяналам: офісныя, вытворча-лабараторныя і дапаможныя памяшканні. Створаны цэнтр прататыпіравання і 3D-мадэлявання, які дапаможа выкарыстоўваць лічбавыя тэхналогіі не толькі ў вытворчасці, але і ў медыцыне. Цэнтральны вылічальны комплекс на базе двух высокапрадукцыйных сервераў здольны забяспечыць патрэбы не толькі самога тэхнапарка, але і іншых арганізацый Гомеля.**

**У 2020 годзе ў Гомелі быў створаны саракаметровы мурал знакамітага гомельскага партызана і падпольшчыка, Героя Савецкага Саюза Емяльяна Ігнатавіча Барыкіна. Выява чалавека-легенды, які адыграў у лёсе Гомеля значную ролю, упрыгожвае фасад жылога дома па вуліцы, названай у яго гонар. Стварэнне мурала — прыклад патрыятычнай ініцыятывы гамяльчан, якая рэалізавалася пры падтрымцы старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя Салаўя. Галоўная ідэя праекта — з дапамогай сучасных графічных прыёмаў візуалізаваць вобраз героя, прыцягнуць увагу моладзі да гісторыі роднага горада, да людзей, чые імёны носяць вуліцы абласнога цэнтра.**



Мадэрнізаваныя птушнікі «Беларуснафта-Асобіна» ў Буда-Кашалёўскім раёне.

# ЯК АПЛАЧВАЮЦЬ ПАСЛУГІ ЖКГ?

## У адпаведнасці з аб'ёмам спажывання, плошчай жылля або колькасцю людзей

**РОСТ аплаты жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) у сярэднім на пяць долараў штогод (для «двухпакаёўкі» з трыма жыхарамі) ужо стаў звыклы для краіны. Першае павышэнне кошту беларусы адчуюць ужо ў «жыроўцы» за люты. З новага года на 4,2 долара (у цэлым) павялічыцца аплата за тэхабслугоўванне і капрамонт жылля, абыходжанне з адходамі, тэхабслугоўванне ліфта і запорна-перагаворных прылад (дамафонаў). Пабольшае і кошт электраэнергіі, паслуг па газа-, электра- і водазабеспячэнні і водаадвядзенні, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў шматкватэрных дамоў. У другім паўгоддзі (з 1 чэрвеня) на 0,8 долара падаражэе цеплазабеспячэнне на патрэбы ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Зменяцца таксама ўмовы аплаты некаторых ЖКП (па колькасці не жыхароў, а квадратных метраў).**

### ТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ, КАПРАМОНТ, ВАДА

Нагадаем, што тарыфы на ЖКП у Беларусі аплачваюцца ў двух варыянтах: з субсідыяй (жыхар аплачвае частку ад поўнага кошту паслугі) і эканамічна абгрунтаваныя (жыхар поўнасцю пакрывае сабекошт аказанай паслугі).

Плата за тэхнічнае абслугоўванне залежыць ад тарыфу на гэтую паслугу і агульнай плошчы жылля. З 1 студзеня субсідзіруемы тарыф (у жыллі, дзе зарэгістраваны чалавек) падрасце больш як на 11 %: з 0,1187 рубля за м$^2$ да 0,1322 рубля. З 1 чэрвеня, мяркуецца, тарыф зменшыцца да 0,1238 рубля за м$^2$.

**Згодна з колькасцю жыхароў, цяпер разлічваецца кошт не толькі за тэхабслугоўванне ліфта і прыборку пад'езда і іншых дапаможных памяшканняў, але і за электрычнасць на асвятленне і работу абсталявання ў іх. З 1 верасня плаціць за ўсе гэтыя паслугі трэба будзе ў адпаведнасці з колькасцю метраў кватэры.**

Поўнасцю пакрываюцца расходы на тэхабслугоўванне ў жыллі, дзе ніхто не зарэгістраваны ці зарэгістравана прыватнае ўнітарнае прадпрыемства або кватэра здаецца ўнаймы для кароткачасовага пражывання. Такі ж кошт прадугледжаны, калі ў грамадзяніна ва ўласнасці або карыстанні ёсць нежылое памяшканне ў доме або нежылая капітальная пабудова, якая выкарыстоўваецца ва ўласных мэтах (акрамя прадпрымальніцкай дзейнасці) і абсталявана лічыльнікамі адносна камунальных паслуг.

Плата за капітальны рамонт таксама ўносіцца па субсідзіруемых тарыфах і налічваецца ў залежнасці ад метражу агульнай плошчы жылля. Сума павялічылася з 0,13 рубля за м$^2$ (летась) да 0,18 рубля за м$^2$.

Кошт водазабеспячэння для беларусаў падрос на 11,3 %. Цяпер кубалітр вады каштуе 1,0445 рубля (было 0,9384). Плата за водаадвядзенне (каналізацыю) таксама павялічылася да 0,8604 рубля за кубалітр замест былых 0,7749 рубля. Ад колькасці спажытых па гэтых тарыфах водных літраў, а таксама наяўнасці лічыльніка на ваду залежыць выніковая штомесячная сума за ваду. Нагадаем, што калі лічыльніка няма, плата за ваду і каналізацыю бярэцца па эканамічна абгрунтаваных тарыфах. Выключэнне толькі для памяшканняў, дзе тэхнічна немагчыма ўстанавіць лічыльнік. Калі ж у кватэры няма не толькі лічыльнікаў, але і жыхароў, то плата за ваду выводзіцца з нарматываў спажывання і «ўмоўнай колькасці жыхароў»: плошчу кватэры дзеляць на 20 м$^2$ і акругляюць у меншы бок — так атрымліваюць умоўную колькасць людзей.

### ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

Кошт электраэнергіі вар'іруецца ў залежнасці ад варыянта тарыфу, які прымяняецца ў доме, а таксама ад таго, на што яна скіравана, і сёлета электрычнасць таксама падаражэла.

У дамах з электраплітамі кошт складае 0,1778 рубля за 1 кВт·г згодна з аднаставачным тарыфам. Дыферэнцыраваны па перыядах максімальных нагрузак тарыф залежыць ад часу сутак. З 22:00 да 17:00 электрычнасць налічваецца па 0,1245 рубля за 1 кВт·г, а з 17:00 да 22:00 — па 0,3556 рубля за 1 кВт·г.

Існуе і дыферэнцыраваны тарыф па трох перыядах часу. Найтаннейшы — у перыяд мінімальных нагрузак (З 23:00 да шасці раніцы) — 0,1067 рубля за 1 кВт·г. Самы дарагі, вядома, у час максімальнага спажывання (з 17:00 да 23:00) — 0,3200 рубля за 1 кВт·г. У астатні час сутак — 0,1245 рубля за 1 кВт·г.

Электраэнергія, якая ўжываецца для ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт у час мінімальных нагрузак (з 11 ночы да шасці раніцы) каштуе 0,1220 рубля за 1 кВт·г. У астатні час сутак — 0,2266 рубля за 1 кВт·г.

**Калі лічыльніка няма, плата за ваду і каналізацыю бярэцца па эканамічна абгрунтаваных тарыфах. Выключэнне толькі для памяшканняў, дзе тэхнічна немагчыма ўстанавіць лічыльнік. Калі ж у кватэры няма не толькі лічыльнікаў, але і жыхароў, то плата за ваду выводзіцца з нарматываў спажывання і «ўмоўнай колькасці жыхароў».**

У дамах, дзе няма сістэм цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння, устаноўлены электрапліты і адсутнічаюць прыборы індывідуальнага ўліку, кошт электраэнергіі, у тым ліку на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне, залежыць ад пары года. З 1 студзеня да 31 мая — 0,0894 рубля за 1 кВт·г — па аднаставачным тарыфе. Гэты ж перыяд, дыферэнцыраваны па двух перыядах сутак — з 23:00 да 6:00 каштуе 0,0626 рубля за 1 кВт·г, у астатні час — 0,1162 рубля за 1 кВт·г. З 1 чэрвеня да 31 снежня аднаставачны тарыф — 0,0909 рубля за 1 кВт·г. Электрычнасць, размеркаваная па часе сутак, каштуе з 23:00 да 6:00 0,0636 рубля за 1 кВт·г, а ў астатні час сутак — 0,1182 рубля за 1 кВт·г.

У жыллі, у якім няма сістэм цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння, аднак ёсць прыборы індывідуальнага ўліку расходу энергіі, кошт электрычнасці, у тым ліку на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне, таксама разлічваецца па перыядзе года. З 1 студзеня да 31 мая — 0,0374 рубля за 1 кВт·г, а з 1 чэрвеня да 31 снежня — 0,0398 рубля за 1 кВт·г. Ва ўсіх астатніх выпадках аднаставачны тарыф на электрычнасць складае 0,2092 рубля за 1 кВт·г. Дыферэнцыраваны тарыф па перыядах сутак у час мінімальных нагрузак (з 22:00 да 17:00) — 0,1464 рубля за 1 кВт·г і ў час максімальных (з 17:00 да 22:00) — 0,4184 рубля за 1 кВт·г.




### ГАЗ У БАЛОНАХ І ТРУБАХ

Тарыфы на газ у Беларусі ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад перыяду года, аснашчэння жылля індывідуальнымі газавымі ацяпляльнымі прыборамі і індывідуальнымі прыборамі ўліку расходу газу і разлічваюцца ў залежнасці ад сітуацыі па кубаметрах газу, плошчы памяшкання ці колькасці жыхароў.

Прадугледжаны два перыяды налічэння ў дамах, дзе ўстаноўлены індывідуальныя газавыя ацяпляльныя прыборы: з 1 студзеня да 31 мая і з 1 чэрвеня да 31 снежня. Гаспадары, якія маюць індывідуальныя прыборы ўліку расходу газу, сёлета ў першым паўгоддзі заплацяць за прыродны газ 0,1366 рубля за м$^3$ (было 0,1205 рубля), а ў другім — 0,1406 рубля за м$^3$ (было 0,1271 рубля). Калі ў доме няма індывідуальнага газавага прыбора, то незалежна ад пары года газ будзе каштаваць 0,484 рубля за кубаметр (было 0,4213 рубля).

У жыллі з індывідуальнымі газавымі ацяпляльнымі прыборамі, але без індывідуальных прыбораў уліку расходу газу ў ацяпляльны перыяд у першым паўгоддзі за абыдзецца ў 0,5936 рубля за метр агульнай плошчы жылога памяшкання (было 0,5320 рубля). У другім паўгоддзі — 0,6312 рубля за м$^2$ (было 0,5936 рубля). У неацяпляльны перыяд першай паловы года дзейнічае тарыф 0,2226 рубля (было 0,1995 рубля), для другой паловы года кошт складае 0,2376 рубля (было 0,2226 рубля).

Калі ў доме ці кватэры не карыстаюцца індывідуальнымі прыборамі ўліку расходу газу, але тут ёсць газавая пліта і цэнтралізаванае гарачае водазабеспячэнне ці ўласны воданагравальнік (за выключэннем газавага), тарыф налічваюць не за кубаметры, а па колькасці жыхароў. Сёлета цана складае 3,87 рубля з чалавека (было 3,7 рубля).

У памяшканнях, дзе ёсць газавая пліта і індывідуальны воданагравальнік, але няма цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння, тарыф стаў 11,13 рубля з жыхара (было 9,69 рубля).

Кошт прыроднага газу ў жыллі з газавымі плітамі, дзе няма цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і індывідуальнага газавага воданагравальніка, сёлета стаў 6,29 рубля з чалавека (было 5,48 рубля).

Звадкаваны газ абыходзіцца спажыўцам даражэй, аднак яго прасцей набыць. У жыллі, дзе ўстаноўлены прыборы індывідуальнага ўліку расходу газу і індывідуальныя газавыя ацяпляльныя прыборы, у першым паўгоддзі 1 м$^3$ звадкаванага газу падаражэе амаль на 12 %: 2,1884 рубля замест 1,9563 рубля. У другім паўгоддзі гэтае паліва будзе каштаваць больш на 7 %: 2,3142 рубля замест 2,1628 рубля. І гэта кошт у ацяпляльны перыяд. У неацяпляльны час цана на газ будзе 1,3107 рубля за кубаметр. Такі ж тарыф 1,3107 рубля (было 1,1409 рубля) за м$^3$ прадугледжаны для дамоў, дзе няма індывідуальнага газавага ацяпляльнага прыбора.

У дамах, дзе індывідуальны газавы ацяпляльны прыбор ёсць, а прыбора індывідуальнага ўліку расходу газу няма, на аплату звадкаванага газу сёлета ў першай палове года ў ацяпляльны перыяд спатрэбіцца 7,0314 рубля за квадратны метр агульнай плошчы жылля ў месяц (было 6,3021 рубля), а ў другой палове — 7,4757 рубля (было 7,0314 рубля). У неацяпляльны перыяд кошт будзе 1,3107 рубля.

Тарыф за звадкаваны газ у памяшканнях з газавымі плітамі і цэнтралізаваным гарачым водазабеспячэннем ці індывідуальным воданагравальнікам (за выключэннем газавага), дзе няма прыбора індывідуальнага ўліку расходу газу, у першай палове года складае 3,93 рубля з чалавека (было 3,42 рубля). Газ у жыллі з газавай плітой і газавым награвальнікам, але без цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння каштуе цяпер 11,14 рубля (было 9,7 рубля). Тарыф на звадкаваны газ у памяшканнях з газавай плітой, але без газавага награвальніка і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння складае 5,42 рубля з жыхара ў месяц (было 4,56 рубля).

**Поўнасцю пакрываюцца расходы на тэхабслугоўванне ў жыллі, дзе ніхто не зарэгістраваны ці зарэгістравана прыватнае ўнітарнае прадпрыемства або кватэра здаецца ўнаймы для кароткачасовага пражывання.**

Больш за ўсё (амаль на 15 %) павялічыўся кошт на газ у балонах. Для гаспадароў, якія карыстаюцца такім палівам, прадугледжаны не толькі тарыфы, але і нормы яго спажывання. На чалавека разлічваецца пяць балонаў вагой да 21 кілаграма ў год. Адзін кілаграм такога газу каштуе 0,93 рубля (было 0,81 рубля), а балон абыдзецца ў 19,5 рубля. І гэта калі ў памяшканні хтосьці зарэгістраваны. Калі ў доме няма зарэгістраваных людзей, кошт значна вышэйшы.

### ЛІФТЫ І ПРЫБОРКА

З 1 чэрвеня на 6,3 % падаражэе ацяпленне і падагрэў вады. Тарыф за 1 Гкал павялічыцца з 20,6216 рубля да 21,9245 рубля. Кошт ацяплення залежыць ад агульнай плошчы кватэры і паказчыкаў агульнадамавога лічыльніка расходу цеплаэнергіі на ацяпленне. Калі такога лічыльніка ў доме няма, то плата залежыць ад агульнага метражу кватэры і сярэдніх нарматываў расходу цеплаэнергіі на ацяпленне квадратнага метра агульнай плошчы будынка.

А з 1 верасня зменяцца ўмовы аплаты за прыборку пад'езда і тэхабслугоўванне ліфта. Сума будзе налічвацца не па колькасці жыхароў, як зараз, а зыходзячы з агульнай плошчы кватэры.

Дарэчы, згодна з колькасцю жыхароў, цяпер разлічваецца кошт не толькі за тэхабслугоўванне ліфта і прыборку пад'езда і іншых дапаможных памяшканняў, але і за электрычнасць на асвятленне і работу абсталявання ў іх. З 1 верасня плаціць за ўсе гэтыя паслугі трэба будзе ў адпаведнасці з колькасцю метраў кватэры.

Тарыф на тэхабслугоўванне ліфта, які цяпер 1,5 рубля, з 1 чэрвеня плануюць зменшыць да 1,43 рубля. А з верасня сума за тэхабслугоўванне ліфта будзе складацца з колькасці метраў, памножаных на мяркуемы тарыф 0,0584 рубля за кожны з іх.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Рэпарцёр

# ЕДЗЕ «ХУТКАЯ» НА ВЫКЛІК

**Ці паўплывала летась пандэмія на колькасць выклікаў «хуткай»? Колькі тэлефануюць у навагоднюю ноч? А як выклікаць медыкаў... глуханямому? Гэтымі пытаннямі наш карэспандэнт напярэдадні свят пацікавіўся на Віцебскай гарадской станцыі хуткай і неадкладнай дапамогі.**



Налета 7 лістапада будзе святкавацца 100-я гадавіна дзейнасці «хуткай». Дарэчы, гістарычная паралель: тады таксама была эпідэмія, толькі халерная (аб'явілі 29 ліпеня 1922 года, а ліквідавалі 4 кастрычніка). На той час у Віцебску жыло 80 тысяч чалавек, сёння — каля 364 тысяч.

7 лістапада 1922-га, да пяцігадовага юбілею рэвалюцыі, пры бальніцы былога Чырвонага Крыжа быў адкрыты пункт хуткай дапамогі. Знаходзіўся ён на цяперашняй вуліцы Дзімітрова. Разам з дзяжурным урачом працаваў санітар, у абавязкі якога ўваходзілі адказы на тэлефонныя званкі, арганізацыя прыёму хворых. У 1925—1926 гадах працавалі ўжо пяць урачоў, тры тэлефаністы, санітар і тры рамізнікі.



Станцыя «хуткай» знаходзіцца каля аўтавакзала, недалёка ад чыгуначнага. Можна сказаць, «элемент брамы горада». У гэтым будынку калісьці была яўрэйская бальніца для беднякоў.

Паводле слоў **галоўнага ўрача Віцебскай гарадской станцыі хуткай і неадкладнай дапамогі Віктара ГОМАНАВА,** пандэмія не стала прычынай для рэзкага росту выклікаў. Для параўнання, калі пазалетась па дапамогу выязджалі штомесяц каля 12,5 тысячы разоў, то летась — 13,2 тысячы.

На першым паверсе будынка станцыі нас з фотакарэспандэнтам запрасілі туды, дзе прымаюць званкі патэнцыйных пацыентаў. Фельчары па прыёме і перадачы выклікаў, калі быў час па-за работай, трохі расказалі пра нюансы. Звычайна іх на змене па шэсць.

Паколькі мы мелі стасункі напярэдадні навагодняга свята, яны расказалі пра асаблівасці ночы з 31 снежня на 1 студзеня. Сказалі, што традыцыя — першыя дзесяць хвілін цішыні ў чарговым годзе. Потым тэлефануюць і расказваюць, што нешта здарылася: выпаў з акна, апёкі атрымаў ад піратэхнікі, пабіўся з госцем... У глуханямых, аказваецца, ёсць магчымасць выклікаць «хуткую» пры дапамозе СМС-паведамленняў.

Прыкладна трэць выездаў — звароты з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі. 17,5 % — праблемы з органамі дыхання, на трэцім месцы — траўмы, атручванні, потым — псіхічныя захворванні. Наконт апошніх, у Віцебску толькі



адна спецыялізаваная брыгада. І «галоўны» ў ёй не тэрапеўт, а псіхіятр-нарколаг. У сумачцы гэтага медыка ёсць дадатковыя лекавыя сродкі, каб супакоіць агрэсіўнага пацыента. І ніякіх наручнікаў, уціхамірвальных кашуль, тым больш балончыкаў з газам. Усё гэта выдумкі. Дзяцей абслугоўваюць педыятрычныя брыгады.

У Віцебску людзям дапамагаюць 34 «хуткія». У Полацкім раёне — 9, Наваполацку — 10, Аршанскім раёне — 14. Усё залежыць ад колькасці насельніцтва. Але ў кожным раёне ёсць спецыялізаваная брыгада «хуткай». Калі трэба, медыкі суседзям дапамагаюць. Калі адлегласць перавышае 50 кіламетраў, дзейнічаюць падстанцыі, напрыклад, у Віцебскім раёне — у гарадскіх пасёлках Суражы і Янавічах, былых райцэнтрах, дарэчы.

Былі выпадкі, калі і ў суседнюю Расію прыязджалі, каб дапамагчы тым, хто пацярпеў, напрыклад у ДТЗ, надзвычайных сітуацыях. Цікава было ўбачыць картку з «фішкамі» — такім чынам раней адзначалі дзе знаходзяцца брыгады. Было вельмі складана кіраваць шляхамі руху аўто. У стагоддзе інтэрнэту ўсё прасцей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Алега КЛІМОВІЧА.**



Тэхналогіі

# ТРАЛЕЙБУСЫ «АДВЯЖУЦЬ» АД ПРАВАДОЎ

## МАЗ адкрыў у Жодзіне новую зборачную вытворчасць электратранспарту

**На яго плошчах будуць выпускаць тралейбусы розных мадыфікацый і найноўшыя электробусы. Штогод тут змогуць збіраць больш за 300 транспартных сродкаў.**

Корпус зборачнай вытворчасці займае больш чым 6600 «квадратаў». «З яе дапамогай МАЗ плануе выйсці на новы ўзровень стварэння высокаэкалагічнага электратранспарту», — адзначыў на цырымоніі адкрыцця тэхналагічнага цыкла **мэр Жодзіна Дзмітрый ЗАБЛОЦКІ.**

У прыватнасці, на МАЗе адзначаюць, што тут будуць выпускаць тралейбусы МАЗ 203Т розных мадыфікацый, у тым ліку з павялічаным аўтаномным ходам. Такая тэхніка ў ідэале зможа самастойна (без «ражкоў») праходзіць на акумулятарах больш за 15 кіламетраў. У будучыні ў Жодзіне таксама будзе арганізавана зборка электробусаў МАЗ 303Е10. Іх вытворчасць пачнецца ўжо сёлета.

Зборка электратранспарту будзе ажыццяўляцца па поўным цыкле, уключаючы зварачныя, рэгулявальныя і фарбавальныя работы. Прадугледжаны таксама ўчасткі для наладкі сістэм кіравання, дыягностыкі электронных сістэм, кантролю і прыёмкі прадукцыі.

Стварэнне высокатэхналагічнага віду транспарту патрабуе вялікіх часавых і матэрыяльных рэсурсаў. Спецыялістам Мінскага аўтамабільнага завода ўдалося забяспечыць вытворчы цыкл, пры якім з тэхналагічнай лініі за год будзе сходзіць больш за 300 адзінак пасажырскага электратранспарту. Іх плануецца пастаўляць у беларускія гарады і экспартаваць у краіны СНД і далёкага замежжа.

Цыкл вытворчасці такі: спачатку каркасы падаюцца на ўчастак для ўстаноўкі восяў і колаў. Следам ідзе рыхтоўка кузава, а за ёй — абшыўка маторнага адсека, устаноўка вузлоў і агрэгатаў электрапрывода. На ўчастку абліцоўвання мацуецца ўнутраная і знешняя абшыўка, прыварваецца дах і манціруецца падлога, пасля чаго тралейбус перадаецца на афарбоўку і сушку. Таксама ўстанаўліваецца падлогавае пакрыццё, шкло, акумулятарныя батарэі і вонкавае электраабсталяванне. Пасля гэтага мацуюцца дзверы, аварыйныя люкі і іншыя элементы. Усё робіцца вельмі тэхналагічна і хутка.

У далейшым тралейбус падаецца на ўчастак адладкі і даводкі механізмаў, а дно апрацоўваецца супраць карозіі. На фінальным этапе — абкатка з наступным аглядам і прыёмкай.

Тралейбусы з аўтаномным ходам — адзін з трэндаў у развіцці электратранспарту ў нашай краіне. Спецыялісты адзначаюць, што выбар на карысць такой тэхнікі з'яўляецца найбольш аптымальным для гарадоў, якія маюць кантактную сетку, паколькі не патрабуе дадатковых капітальных укладанняў у развіццё інфраструктуры.

Прынцып работы такога віду транспарту і яго галоўнае адрозненне ад звычайнага тралейбуса заключаецца ў тым, што машына на хаду атрымлівае зарад электрычнасці, які назапашваецца ў блоках батарэй. Але ў любы момант тралейбус можа адключыцца ад токапрыёмнікаў і далей ехаць аўтаномна — запасу ходу хапае больш чым на 15—20 кіламетраў у залежнасці ад тыпу батарэі. Пры гэтым тралейбусы з аўтаномным ходам дазваляюць пашыраць маршрутную сетку ў новых жылых раёнах без пракладкі кантактных сетак і адначасова павышаюць эфектыўнасць выкарыстання дзеючай сеткі. Да таго ж яны больш манеўраныя ў параўнанні са сваімі «калегамі», якія працуюць толькі ад кантактнай сеткі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Грошы

# РАХУНКІ Ў КАШТОЎНЫХ МЕТАЛАХ? КАЛІ ЛАСКА!

**У нашай краіне з першых дзён гэтага года адмяняюцца абмежаванні па адкрыцці рахункаў у каштоўных металах банкамі і фізічнымі асобамі за мяжой. Пра гэта паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка.**

Такім чынам, для юрыдычных асоб (акрамя банкаў) устанаўліваецца паведамляльны парадак адкрыцця рахункаў у каштоўных металах у банках і іншых крэдытных арганізацыях за межамі нашай дзяржавы.

Дагэтуль для адкрыцця рахункаў у каштоўных металах за мяжой беларускім юрыдычным і фізічным асобам неабходна было атрымаць дазвол Нацыянальнага банка.

Таксама з 1 студзеня 2021 года зацверджана інструкцыя па здзяйсненні банкамі банкаўскіх аперацый з каштоўнымі металамі. Гэты дакумент утрымлівае шэраг новаўвядзенняў, у ліку якіх можна вылучыць нормы, што прадугледжваюць пашырэнне магчымасцяў выкарыстання банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання пры ажыццяўленні аперацый з каштоўнымі металамі.

Таксама ў інструкцыі ўлічаны прапановы банкаў па скарачэнні колькасці дакументаў, якія афармляюцца пры рабоце з каштоўнымі металамі.

Прынятыя змяненні будуць спрыяць уніфікацыі і спрашчэнню заканадаўства, якое рэгулюе банкаўскія аперацыі з каштоўнымі металамі, што дасць дадатковы імпульс у развіцці дадзенага сегмента банкаўскай дзейнасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# УЛАДЗІМІР МУЛЯВІН: СЭРЦА, ДУМЫ І ЛЕГЕНДЫ...

**Калі называць самых галоўных беларускіх дзеячаў культуры, сярод першых абавязкова ўспомніш яго... Уладзіміра Мулявіна, чыё 80-годдзе мы сёння адзначаем. Геній, сапраўдны народны артыст, той, хто ўмеў перадаць душу беларускай песні... А між тым нарадзіўся ён у Свярдлоўску і беларускіх каранёў не меў. На звязаныя з гэтым пытанні адказваў з усмешкай: «Пра тое, што родам не з Беларусі... Я ўжо забыўся пра гэта... Па-мойму, я ніколі і не з'язджаў з Беларусі...»**
**Многія разважалі пра «феномен Мулявіна», спрабуючы яго зразумець. Ад музыкаў я часам чула паважліва-захопленае: «У яго была «чуйка».**
**Гэтак, пэўна, спрабавалі растлумачыць, чаму ўсё, да чаго ён датыкаўся, — у якасці аранжыроўшчыка, выканаўцы ці кампазітара —ператваралася ў дыяменты. Чаму супрацоўніцтва з ім абуджала асаблівы творчы імпэт у іншых.**
**Легендарныя «Песняры», створаныя Уладзімірам Мулявіным, сталі брэндам нашай культуры ва ўсім свеце, а беларускія народныя песні і песні на творы беларускіх паэтаў дзякуючы яму засталіся хітамі на ўсе часы. Аднак у кожнага шэдэўра «ад Мулявіна» маецца свая гісторыя. Давайце ўспомнім некаторыя з гэтых гісторый, агучаныя самім Мулявіным і ягонымі сябрамі і паплечнікамі.**



На радзіме Ігара Лучанка, 1981 г.

## «МАЛІТВА»

Аб з'яўленні знакамітай песні на верш Янкі Купалы «Малітва» ў свой час распавёў аўтар музыкі Алег Моўчан, які, на жаль, у 2019 сышоў з жыцця.

*«Як зараз памятаю, Уладзімір Георгіевіч прыехаў на студыю і працягнуў мне зборнік вершаў Янкі Купалы, на старонцы з закладкай я ўбачыў вялікі верш, які складаўся з мноства строф. «Паспрабуй напісаць песню, — сказаў ён, — я б хацеў выканаць баладу на гэтыя словы». Мне заўсёды хацелася напісаць што-небудзь, што б выканаў Мулявін. Але тут занадта шмат паэтычнага тэксту для адной песні. «Нічога, калі музыка добрая, яе можна выконваць доўга, — аджартаваўся Уладзімір Георгіевіч».*

Але творчы працэс аказаўся цяжкім, варыянт за варыянтам забракоўваліся... Дапамог выпадак: кампазітара запрасілі на музычную праграму «Звездный прибой», удзельнікаў якой размясцілі ў Севастопалі, у каютах прычаленых караблёў. Нечакана з'явілася шмат вольнага часу... Там і нарадзілася вядомая нам мелодыя.

*«І вось настаў той момант, калі я запрасіў Уладзіміра Георгіевіча паслухаць варыянт песні. Ён устаў каля манітораў, а я ўключыў акампанемент і пачаў напяваць яму баладу. Мулявін, як заўсёды, моўчкі праслухаў усю кампазіцыю да канца і не выявіў ніякай рэакцыі, але па яго вачах я зразумеў, што рэч зачапіла яго. Ён папрасіў яшчэ раз прайграць усю кампазіцыю, узяў у мяне клавір песні і паехаў дадому. Праз некалькі дзён патэлефанаваў мне і сказаў, што трэба паспрабаваць запісаць песню. Мы сабраліся на студыі. Вось тут Мулявін і ўразіў мяне да глыбіні душы. Ён запісаў песню ўсяго за некалькі дубляў, прычым гэта было выканана так натуральна і здорава, што стала відавочна: на свет з'явіўся яшчэ адзін сапраўдны твор. «Малітва» і Мулявін настолькі гарманічна зліліся адно з адным, што пасля многія лічылі: музыку да гэтай песні напісаў сам Мулявін. Нават у адной з энцыклапедый песня была надрукаваная пад ягоным прозвішчам».*

## РОК-ОПЕРА «ПЕСНЯ ПРА ДОЛЮ»

Вясной 1976 года ў рэпертуары «Песняроў» з'явілася рок-опера-прыпавесць «Песня пра долю» на вершы Янкі Купалы. У аснове была купалаўская «Адвечная песня», лібрэта напісаў Валерый Яшкін, музыку стварыў сам Мулявін. Спявачка Людміла Ісупава, якая тады была салісткай «Верасоў», успамінае, што Мулявін запрасіў яе спяваць у оперы, матывуючы гэта тым, што яна надоечы нарадзіла сына і што ёй лягчэй будзе ўжыцца ў вобраз Жонкі Мужыка: «Калыханка» з будучай оперы-прыпавесці, можна сказаць, стала любімай песняй майго маленькага сына».

Уладзіміру Мулявіну даводзілася ваяваць за свой наватарскі твор, бо чыноўнікі ад культуры лічылі, што ён «занадта цяжкі для ўспрымання публікай».

*«Але я ведаю, як успрымаліся сур'ёзныя праграмы, нас прасілі і ў Расіі, і ў Грузіі, дзе высокая песенная культура, выконваць «Песню пра долю». Прычым яна гучала на беларускай мове, па ўсе ішла гадзіну дваццаць, і людзі, абсалютна не ведаючы мовы, без перакладу ўважліва слухалі. Праграма ішла з вялізным поспехам, мы гады два яе вазілі на гастролі. Пісаў я яе спецыяльна на Толю Кашапарава. Ён галоўную партыю выконваў — партыю Мужыка, па сюжэце — ад яго нараджэння да смерці. Але вось як было да таго. Заўтра ў нас прэм'ера «Песні...», а сёння з міністэрства тэлефануюць: «Перарабіце канцоўку!» У Купалы, як вядома, у канцы паэмы Мужык памірае. Але потым расплюшчвае вочы, глядзіць на гэты свет і кажа: маўляў, лепей сысці зноў у магілу, чым глядзець на гэты свет. Разумееце, так у Купалы. Але міністэрскі чыноўнік настойвае: не, маўляў, трэба мажорную канцоўку зрабіць. І я прыдумаў. Знайшоў усё ж некалькі вершаў — па-мойму, паэт проста «выцісную» іх з сябе. Ведаеце, гэта было няпроста — знайсці ў Купалы вершы «ўра-патрыятызм»: бо ён быў вельмі сумленным у гэтых адносінах чалавекам», — успамінаў артыст.*

Опера адразу ж займела незвычайны поспех: пасля прэм'еры ў філармоніі канцэрты перанеслі ў Палац спорту, прадстаўленні даваліся па два разы на дзень на працягу дзесяці дзён, гледачы сядзелі на прыступках, стаялі ў праходах.

## «ЧЫРВОНАЯ РУЖА»

Мулявін выдатна ведаў беларускую паэзію, і не толькі сучасную. Тэкст песні «Чырвоная ружа» ён знайшоў у старым сярэднявечным зборніку, які яму падарылі падчас гастроляў у Нью-Ёрку прадстаўнікі беларускай дыяспары. Чытаў у самалёце па дарозе дадому... Магчыма, тады ўжо складваўся будучы нумар. А вось у жонкі Мулявіна, знакамітай актрысы Святланы Пенкінай, свая гісторыя:

*«Яна, гэтая песня, для мяне каштоўны падарунак. Яго прысвячэнне. І яго адказ. Памятаю, мы вярнуліся з філармоніі, і я прараўла да вечара. Хадзіла па пакоі і паўтарала: «За што? За што?» Справа ў тым, што ў мужчынскім «песняроўскім» калектыве мяне, жанчыну, як бы не спрабавалі зразумець. Гэта зусім іншае, чым калі мужчына прыходзіць працаваць у жаночы. Словам, маё рытарычнае «За што?» матэрыялізавалася ў незвычайнай прыгажосці адказ. Дык вось, праз тры дні да мяне падыходзіць Валодзя і пытаецца: «Хочаш ведаць, за што, тады паслухай народную мудрасць...» Ён узяў гітару і пачаў спяваць «Чырвоную ружу», дзе ёсць сімвалічнае «...за тое, за тое, як ты красіва».*

## МУЗЫЧНЫ СПЕКТАКЛЬ «НА ЎВЕСЬ ГОЛАС»

У 1988 годзе ў рэпертуары «Песняроў» з'явілася праграма «На ўвесь голас» на словы Уладзіміра Маякоўскага. Святлана Пенкіна так распавядае гісторыю яе з'яўлення ў кнізе выдавецтва «Мастацкая літаратура» «І сэрцам, і думамі», якую ўклала вядомая журналістка Людміла Крушынская да юбілею Мулявіна:

*«Цяпер, мабыць, час пагаварыць пра самую спрэчную праграму «Песняроў». Як у жыцці Мулявіна з'явіўся Маякоўскі? Мы наведвалі нашых знаёмых сельскіх настаўнікаў. У іх вясковым доме стаяла бамбукавая этажэрка, на якой размясціліся трынаццаць тамоў збору твораў Маякоўскага. Чырвонага колеру акадэмічнае выданне. Неяк Валодзя спытаў у мяне: «Ты Маякоўскага ведаеш?» Не, адказваю, не ведаю. Ён кажа: «А я ведаю: «Я достаю из широких штанин...» На наступны дзень: «Маякоўскага ведаеш?» — «Ды не, Вова, не ведаю...» — «А я ведаю: «Я достаю из широких штанин...» — Валодзька, вось стаяць томікі, давай знаёміцца з Уладзімірам Уладзіміравічам». Мы пачалі «падарожжа» з трынаццатага тома — да першых вершаў. Адразу ж уразілі яго дзённікі, успаміны, калі ішло цкаванне Маякоўскага. І там ёсць такія моманты, калі паэту казалі: «Ды плюнь ты на ўсё!» А ён адказваў: «Ды я ўжо не плюю, я харкаю крывёю, і мне здаецца, што я ўжо нікому не патрэбны». Нешта падобнае адбылося і з Валодзем, калі яго не пускалі на сцэну. Рэальна не пускалі, публічна не дазвалялі... Вось так мы, паступова вывучаючы старонкі тамоў, дайшлі да футурыстычных твораў, такіх як «Если звезды зажигают...», «... Вспомни — за этим окном впервые руки твои, исступленный, гладил. Сегодня сидишь вот, сердце в железе». З Маякоўскага, вобраз якога ўвасоблены ў помніку на плошчы яго імя ў Маскве і пастаянна асацыюецца з «КИМ», «ВТО» і гэтак далей, стаў зляталь гэты вось «цэмент», з'явілася аголеная душа, скрываўленая, вельмі пяшчотная. І тады я спытала ў Валодзі: «Ну як — ведаеш Маякоўскага?» А ён адказаў: «Не, Светка, не ведаю». І толькі тады, калі гэта вымавіў, прыступіў да напісання музыкі. Яму захацелася аддаць даніну паэту, асобе касмічнага маштабу, якая апярэдзіла свой век. І гэта адначасова была першая праграма на рускай мове — даніна Валодзі сваім караням. Я не ведаю, ці ёсць такая расійская група, якая ўзялася б за напісанне музыкі на вершы Маякоўскага. А вершы самыя розныя, і якая сатыра там гучыць! Калі мы здавалі праграму мастацкаму савету (я была аўтарам сцэнарыя гэтага песеннага спектакля «Ва ўвесь голас»), мне задалі пытанне: «А тэкст залітаваны?» Я пытаюся: «Чый? Маякоўскага? Выдання пяцьдзясят шостага года?» Такога Маякоўскага яшчэ не ведалі. Нядзіўна, што калі праграма выйшла ў свет, гэта быў сапраўдны шок. З іншага боку, для Валодзі як для кампазітара яна была вельмі важная. Чаму? Ды таму, што ён не была «папса» на патрэбу гледачу таго смутнага, можна сказаць, катастрафічнага часу на сутыкненні эпох. Мулявін ствараў тады буйныя музычныя палотны, магутныя песенныя спектаклі. Разумеў: без увасаблення падобных праграм у жыццё далейшае развіццё «Песняроў» апярэдзіць не-маг-чы-ма!»*

## МУЗЫКА ДА ФІЛЬМА «КАМЕДЫЯНТ»

Сярод творчай спадчыны Уладзіміра Мулявіна — музыка да фільма «Камедыянт», знятага вядомым рэжысёрам Уладзімірам Арловым у 1987 годзе па сцэнарыі пісьменніка Алеся Асташонка. Вось што расказвае пра гэта рэжысёр у кнізе «Нота лёсу», якая выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»:

*«Гэта была восень 1987 года. У аснову фільма быў пакладзены факт знікнення на трыста дзён, пасля разгрому паўстання 1863 года, першага беларускага драматурга Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. «Камедыянт» паказваў дзве гадзіны, якія правёў у сваім доме галоўны герой: ад таямнічага прыходу ў калядная масцы да спрытнага знікнення перад нямечым арыштам. Мне хацелася... паказаць беларуса не ў традыцыйна надакучлівым кажусе, у лапцях, з аўтаматам ППШ, а інтэлігента,*



Апошні штрых перад выхадам на сцэну. Уладзімір Мулявін і Святлана Пенкіна, 1997 г.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ЯК З'ЯЎЛЯЛІСЯ ЯГОНЫЯ ПЕСНІ

*які музіцыруе, свабоднага ў думках і меркаваннях, які размаўляе па-англійску, па-французску. Сюжэтна клалася даўняя Валодзіна песня на вершы Купалы «І як тут не смяяцца...» — я рабіў яшчэ адну спробу «экранізаваць» яе. Да таго ж яго голас нават неяк адпавядаў знешнасці выканаўцы галоўнай ролі Валерыя Філатава. Натуральна, Мулявіну я прапанаваў пісаць музыку да фільма. У кожным куплеце сатырычнага купалаўскага тэксту ўзнікаў новы персанаж: урач-хапуга, жулікаваты выскачка-пан, надзьмуты шляхціц. Я, даўшы Мулявіну спяваць «за аўтара» (які сарказм гучыць у яго голасе!), прапанаваў астатняе разыграць па ролях, што ён і зрабіў. За персанажаў спявалі яго астатнія музыкі. Фанаграмы яны запісалі на новай апаратуры ў зале Цэнтра юных тэхнікаў на вуліцы Макаёнка, а накладанне галасоў зрабілі проста ў пакойчыку за сцэнай філармоніі — Валодзя ганарыўся новымі «шураўскімі» мікрафонамі, якія дазвалялі рабіць запіс без заказу студыі радыё... Дакладна ведаю, што сачыніў Валодзя яшчэ на тэкст Купалы «Не карыце мяне...» Інструментальнае ўступленне ідзе на кадрах, калі галоўны герой спрабуе пісаць, тварыць, а рукі — у пальчатках, у мундзірных абшлагах з залатой вышыўкай, папросту брудныя — «накіроўваюць» яго пяро. «Калі столькі бяды, столькі гора і слёз бачыў укруг заўсягды, столькі й сам перанёс...» Кантрастам на экране ідзе мірнае, амаль ідылічнае жыццё творчай, а таму небагатай, дружнай сям'і героя; усё знята ў светлай гаме, кадр працяты сонечнымі прамянямі. А фонам — трагічна-самотна звініць голас Мулявіна: «Не магу песень пець, крывіць роднай душой, песні весела пець, калі ў смуце край мой. Не карыце мяне...»*

## «ГАНУЛЬКА»

А вось якую гісторыю стварэння песні «Ганулька» расказваў кампазітар Ігар Лучанок — яна таксама прыводзіцца ў кнізе «І сэрцам, і думамі...»:

*«Разам з Мулявіным мы зрабілі і песню «Ганулька» на вершы Якуба Коласа «Каханне». Калі ў Валодзі прыхапіла ныркі, я адвёз яго ў Трускавец, у санаторый, дзе быў у мяне сябар, выдатны лекар-хірург. Ён уладкаваў нас у шыкоўную гасцініцу, у пакой на дваіх — і мы лячыліся. Бывала, Валодзя глыне чарку каньячку — і ў ванну, каб «пайшлі камяні». І — ішлі. Вось за такім працэсам лячэння і з'явілася «Ганулька», наша агульнае «дзіця»: нехта напісаў запеў, хтосьці прыпеў і гэтак далей. Вось і атрымалася прыгожая і ласкавая мелодыя на прыгожыя коласаўскія словы: «— Скажы мне, Ганулька, Ці любіш мяне? — Люблю, — ты сказала,— Аж сэрца мне схне!»*



У Палацы спорту. Мінск. 1978 г.

* * *

Уладзіміру Мулявіну сёння споўнілася б 80 гадоў — у прынцыпе, ён мог бы яшчэ жыць і ствараць... Крыўдна заўчасна страчваць такіх вялікіх людзей. Але абнадзейвае, што ягоная спадчына не забытая — яна становіцца ўсё больш запатрабаванай, а яго песні даюць надзею ў нялёгкія часы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Праз час

## Валерый МУЛЯВІН:

# «Я нават падчас пералётаў заўважаў, як бацька ў паўдрымоце выстукваў пальцамі нейкі рытм»

### Пяць фактаў пра Уладзіміра Мулявіна



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Уладзімір Мулявін на прыкладзе ўласнага жыцця і творчасці паказаў, наколькі любоў — пачуццё стваральнае. Пра гэта сведчаць і яго песні, якія сталі хітамі, і тое, як успамінаюць і захоўваюць памяць аб ім родныя, блізкія, сябры і калегі. Напярэдадні юбілею Уладзіміра Георгіевіча «Звязда» сустрэлася з сынам «песняра», каб знайсці новыя штрыхі да партрэта творцы.**

**1. Калі закахаўся ў Святлану Пенкіну, скінуў дзеля яе вагу, а ў Афрыцы ратаваў яе ад малярыі**

***— Валерый Уладзіміравіч, канцэрты памяці бацькі, спробы розных людзей прасачыць яго жыццёвы і творчы шлях — гэта заўсёды радасць для вас альбо ўсё ж «раскрыванне» душэўнай раны?***

— З татам у мяне звязана шмат добрых успамінаў, і я з радасцю заўсёды дзялюся імі. Але боль ад страты роднага чалавека па-ранейшаму жыве ўнутры, і ён нікуды не знікне. Я працяглы час пасля бацькавай смерці не мог развітацца з ім у сэрцы. Гэта немагчыма. Ты проста з часам вучышся прымаць усё, як ёсць.

***— Што ці хто дапамаглі вам?***

— Перш за ўсё мне дапамагала мама. У яе ўсё трансфармавалася ў імкненне ўсімі магчымымі шляхамі зберагчы памяць пра тату. Яна пераключылася ў гэтае рэчышча. І няхай прагучыць банальна, час таксама лечыць і згладжвае вастрыню ўспрымання таго, што адбылося. Нічога не зменіш і назад не вернеш... Застаецца толькі памяць.

***— Які прыклад мужа, калі браць яго стаўленне да вашай маці, бачылі перад сабой?***

— Дай бог кожнаму знайсці такую жанчыну, як мама, і любіць яе так, як гэта ўмеў тата. Яны супадалі фізічна, духоўна і творча. Тата вельмі прыгожа заляцаўся да мамы. Ён заўсёды клапаціўся аб ёй: лятаў да яе на здымкі, даглядаў, калі яна хварэла. Неяк праехаў да яе тысячу кіламетраў за рулём у бальніцу. Нават скінуў вагу дзеля мамы, як яны толькі пачалі сустракацца. Вартаваў і ратаваў, калі яна ў Афрыцы захварэла на малярыю. Прысвячаў ёй песні. Бацька кахаў маці, і гэта было ўзаемна.

**2. Быў просты ў зносінах, а калі памыляўся ў людзях, прымаў гэта дастойна**

***— Калі казаць пра бацькоўства, у чым вам хочацца быць падобным на тату?***

— У многіх рэчах. Тое, што я бачыў у бацьку, стала пэўным арыенцірам у жыцці. Прыстойнасць была для яго заўсёды характэрная. Мужнасць і стойкасць выразна заўважныя ў ім, асабліва пасля аварыі. Я рос побач з мудрым мужчынам, які меў багаты жыццёвы вопыт. Бацька быў вельмі простым чалавекам у зносінах з іншымі. Умеў і любіў пажартаваць. У яго было пачуццё такту. Бацьку даводзілася памыляцца ў людзях, але ён годна гэта прымаў, хоць і моцна перажываў. Такія якасці, як дабрыня, шчырасць і жаданне дапамагчы іншым, таксама былі для мяне паказальныя ў ім.

**3. Калі вярнуўся з гастроляў па Афрыцы, то быў з барадой, а ў падарунак сыну прывёз барабаны**

***— Вы шмат з ім паездзілі па свеце. Гэта, думаю, таксама ўплывала на ваша выхаванне і фарміраванне як асобы...***

— У нас была якая сітуацыя: тата з мамай працавалі ў адным калектыве, таму так атрымлівалася, што я быў амаль увесь час побач з імі. У садок амаль не хадзіў, затое ездзіў з бацькамі на гастролі. А калі мяне нельга было ўзяць з сабой (гэта былі іх паездкі ў Афрыку, Манголію і Паўночную Карэю), то да нас прыязджаў дзядуля, каб пабыць са мной. Вядома, я крыўдзіўся тады, але потым выявілася, што рашэнне бацькоў было правільным. Яны ведалі і ацэньвалі рызыку і жадалі мяне абараніць.

***— Што потым вам тата расказваў пра паездкі, у якія вы не траплялі?***

— Калі тата вярнуўся з гастроляў па Афрыцы, то ён быў з барадой. А ў падарунак мне прывезлі барабаны. Расказвалі шмат цікавага. Так, напрыклад, бацькам удалося пабываць там, дзе былі французскія калоніі, пабачыць афрыканцаў з французскімі манерамі. Альбо неяк іх пасялілі ў бунгала на тэрыторыі прыватнага парку, дзе можна было назіраць шмат рознай жыўнасці. І каб не раздражняцца ад гэтага суседства, артысты давалі экзатычным жывёлам нашы звычайныя імёны.



«Вялікі дзякуй тату, што паказаў мне свет».

***— А якімі былі вашы ўражанні ад гастрольных паездак?***

— Вялікі дзякуй бацьку, што паказаў мне свет. Бо я рос у савецкі час, і трапіць за мяжу тады было вялікай удачай. Пасля таго як мы аб'ездзілі савецкія краіны, былі паездкі ў Польшчу, Германію, Амерыку. Напярэдадні нашага першага пералёту за акіян тата сказаў: «Глядзі, сын, ты можаш выбраць — альбо мы едзем на гастролі і прывозім табе падарунак, альбо на гэтыя грошы купляем табе білет». Выбраў апошняе. У выніку, праўда, атрымаў і паездку, і падарунак... А калі трапілі ў Нью-Ёрк, то быў пад уражаннем ад горада з разнастайнасцю культур. У нашых гастрольных вандроўках па Амерыцы я назіраў, што хоць «Песняроў» там і не ведалі так, як на Радзіме, але публіцы іх выступленні падабаліся. Іх музыка сцірала межы паміж краінамі і людзьмі. Яшчэ пасля канцэртаў артыстам дарылі кветкі, і пасля тата заўсёды дарыў іх жанчынам у гасцініцы, дзе мы жылі. А калі мы высяляліся з атэля, тата напамінаў, што трэба пасля сябе пакінуць парадак: «Пра Мулявіна будуць меркаваць не толькі па тым, як я спяваў на сцэне, а і па тым, як з'ехаў з гасцініцы». Бацька заўсёды паважаў працу іншых людзей.

**4. Найлепшым адпачынкам Мулявін лічыў «паляжаць з кнігай»**

***— Стамляліся ад рытму гастрольнага жыцця?***

— Пераезды цяжкія для артыстаў, бо часам адразу пасля пералёту ім трэба быць на сцэне. Няпроста і маральна. Тата мне расказваў, як, атрымаўшы звестку аб смерці брата, усё роўна даваў канцэрт, хоць і амаль праз слёзы і з болем у сэрцы. Але ён не мог адмовіць людзям, якія чакалі іх выступлення.

***— Здараліся ва Уладзіміра Георгіевіча творчыя крызісы?***

— Такога, каб яму не пісалася, я не памятаю. Калі ішла работа над нейкай праграмай, то нават на адпачынку ён абдумваў яе. У таты заўсёды былі нейкія планы, ідэі, і так было да апошняга. Бывала, я нават падчас пералётаў заўважаў, як бацька ў паўдрымоце выстукваў пальцамі нейкі рытм. Ён казаў, што для яго лепш за ўсё паляжаць з кнігай. Але ж калі гэта было чытанне паэзіі, то пасля «вырастала» ў праект. Творчасць і бацька былі непадзельныя.

***— Гледзячы на поспех бацькі, вам не хацелася стаць такім жа артыстам?***

— У мяне было ўсведамленне, што для гэтага трэба быць як мінімум ім. Сам я ў дзяцінстве больш марыў пра кіно. Але вельмі ўдзячны тату, што ён настойваў на тым, каб я вучыўся ў музычнай школе. Ён даваў мне свабоду выбару, але разам з тым карэкціраваў мой шлях у нейкіх момантах.



«Я рос побач з мудрым мужчынам, які меў багаты жыццёвы вопыт».

**5. Любіў кнігу Гашэка «Прыгоды бравага салдата Швейка»**

***— Ці супадалі вашы густы, напрыклад, адносна музыкі, кніг?***

— Так, на шчасце, у музыцы нам шмат падабалася аднолькавага. Любілі слухаць «Бітлз», Джо Кокера, Чайкоўскага, джаз... Што датычыцца літаратуры, вельмі ўдзячны бацьку за знаёмства з кнігай «Прыгоды бравага салдата Швейка». Маглі мы і кіно паглядзець, бо абодва любілі, каб кінастужка была якаснай, незалежна ад жанру. Разам машыны рамантавалі, на рыбалку ездзілі, ежу гатавалі...

***— Як паўплываў на вас татаў сыход?***

— Пасля яго смерці ўсё, што ён заклаў у мяне, набыло вялікае значэнне ў маім жыцці. І гэтыя моманты сталі мне апорай. Вось, скажам, тата любіў бываць у царкве, каб памаліцца, падумаць, і мяне браў з сабой. І часам, калі я сумую па ім альбо перажываю нейкія складаныя моманты, то таксама магу пайсці ў храм. Альбо, прымаючы нейкае рашэнне, асабліва калі і таты яно датычыцца, я спрабую ўявіць, як бы рабіў ён сам. Я тады рэзка стаў дарослым...

Ведаеце, я веру, што чалавек пасля смерці трапляе ў свет духоўны. І спадзяюся, цяпер мае бацькі разам і зверху назіраюць за мной, радуюцца, дапамагаюць і берагаюць.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва суразмоўцы.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 25 января 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объект продажи (**лот № 2**) не выделен. Возмещение затрат по выделению земельного участка под объект недвижимости возлагается на Покупателя (победителя аукционных торгов). **3.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | | |
| 1 | **Пожарная сигнализация, инв. № 32(ж)** | **8 730,00** | 436,50 | 873,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 320/U-_____**, общей площадью **2 131,8** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, агр. Лукский, ул. Зеленая, 13 | **183 600,00** | 9 180,00 | 18 360,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 января 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 января 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звезда» от 25.11.2020 г. № 230 (29344). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 28 января 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–14, 17, 20–23, 25–31) ранее опубликован в газете «Звезда» от 23.06.2020 г. № 120 (29234), www.bankrot.gov.by.**
**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 января 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 26 января 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звезда», а также затраты, связанные с организацией и проведением торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звезда» от 23.06.2020 г. № 120 (29234). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
# ТОАО «ГРОДНО КУЛЬТТОРГ»

| | | |
|---|---|---|
| | **Лот № 1** | |
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Капитальное строение, инв. № 400/С-152529** (склад) общей площадью 346,7 кв. м, кирпичное, 1960 г. п.; **капитальное строение, инв. № 400/С-135774** (благоустройство территории) общей площадью 96,5 кв. м, составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие 24,0 кв. м, цементно-бетонное покрытие 72,5 кв. м, ограждение железобетонное 35,60 м, ограждение кирпичное 6,90 м; **линии электропередач кабельной** состоящей из: линии электропередач кабельной АПВГ 3*2,5, линии электропередач кабельной АВВГ 4*16 | |
| **Информация о земельном участке** | Кадастровый номер 440100000001011667, площадь – 0,0825 га, назначение – для обслуживания здания склада, право постоянного пользования, в соответствии с генеральным планом г. Гродно объект расположен в производственной и коммунально-складской зоне | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., г. Гродно, ул. Победы, д. 22Б | Обременения: часть площадей сдается в аренду: инв. № 400/С-152529 (15,0 кв. м – по 30.06.2022 г.) |
| **Начальная цена с учетом НДС: 186 323,42 рублей** | | Задаток (1 %) – 1 863,00 рублей |
| **Сведения о продавце:** ТОАО «Гродно Культторг», г. Гродно, ул. Пушкина, 37А, тел. 8 (0152) 568291 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 дней с момента проведения аукциона. **Оплата:** рассрочка платежа на 12 (двенадцать) месяцев со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей, первоначальный платеж в течение одного месяца с момента заключения договора купли-продажи в размере 30 % от цены продажи | | |
| **Торги состоятся 26 января 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Срок подачи документов** | **По 20 января 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by. Тел. для справок 8 (0152) 621632 | | |
| *Предыдущая публикация: газета «Звезда» от 20.11.2020 года* | | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Смолевичи-Сузон» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА

*(составные части и принадлежности: пристройка),*
**общей площадью 58,1 кв. м 1950 года постройки по адресу: Минская область, Червенский район, Руднянский с/с, аг. Рудня, ул. Почтовая, 5.**
**Право собственности ОАО «Смолевичи-Сузон» на жилой дом в ЕГРНИ не зарегистрировано.**

Начальная цена (без НДС) – **2 589,80** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **258,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **16.02.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.02.2021** до **16.00** по указанному адресу в **каб. 320.**

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 029 136-31-11.**

УНП 691747895

## ИЗВЕЩЕНИЕ об аукционе 22 января 2021 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44951 «Здание очистных сооружений» |
|---|---|---|
| Номер лота | 2 | 3 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Ю |
| Тип помещения | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 1930,1 | 205,0 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 0,3941 | 0,1879 |
| Начальная цена продажи (бел. руб.) | 341 298,70 | 35 357,51 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка (бел. руб.) | 34 129,87 | 3 535,75 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Единовременный платеж |
| Характеристика объекта | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 кв. м, помещение цена доборных изделий 1456 кв. м, пристройка 12 кв. м, навес 24 кв. м, градирня 33 кв. м, два теневых навеса 7 кв. м. Покрытие бетонное 1030 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Здание одноэтажное, кирпичное, с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть). Резервуары для воды – 2 шт. Ввод в эксплуатацию – 1994 г. |

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |
| Продавец аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |

**Аукцион состоится 22 января 2021 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале ОАО «ПКСИ».**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

**2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 21 января 2021 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 21 января 2021 года включительно, тел. (80165) 37-16-19, тел./факс: (80165) 37-16-66, 37-17-25.**

**Контактный телефон 375-29-640-80-37.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
# ОАО «Агро-сад Рассвет»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов:** Лот – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-55337 (наименование: здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 623,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, 31, 0,1 км, западнее д. Несвило, здание, на земельном участке с кадастровым номером 121284600001000048, площадью 0,3644 га | | | |
| **Начальная цена, руб. (без НДС)** | **9 175,04** | **Размер задатка, руб.** | **917,50** |
| **Продавец** | ОАО «Агро-сад Рассвет», Брестская обл., аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, УНП 200035041 | | |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Информация о возмещении затрат** | Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона | | |
| **Аукцион состоится 26 января 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** | | | |
| Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02 | | | |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00** | | | |
| **Последний день приема заявлений – 25 января 2021 г. до 17.00** | | | |
| Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Агро-сад Рассвет» размещено в газете «Звязда» от 15.10.2020 | | | |

# БАЙКЕР З ВАСЬМІДЗЯСЯТЫХ

## Ён удзельнічаў у аўтапрабегах, а потым сабраў калекцыю савецкіх матацыклаў

**Як ні дзіўна, але аб цікавай экспазіцыі даведалася выпадкова. А між тым аграгарадок Парэчча, дзе жыве Генрых Дзітко, лічу сваёй другой радзімай. Тут прайшлі самыя лепшыя школьныя гады. Дарэчы, дом калекцыянера таксама знаходзіцца на вуліцы Школьнай. І, уявіце сабе, за ўвесь гэты час амаль ніхто не ведаў, што ў вялікім ангары былога інжынера знаходзіцца незвычайная калекцыя матацыклаў амаль усёй савецкай эпохі. Дык чаму яны не могуць стаць музейнай экспазіцыяй? З гэтым і іншымі пытаннямі накіравалася ў госці да Генрыха Адамавіча.**



### У ДУШЫ І НА «ЯВЕ»

Як аказалася, Генрых Дзітко — колішні байкер. У маладосці ён ганяў на «Яве», што па мерках 80-х гадоў было даволі прэстыжна. І хоць чэшскія матацыклы былі не танныя, малады інжынер набыў гэту тэхніку, калі пасля інстытута працаваў на МТЗ. Пераехаўшы ў Гродна, стаў удзельнічаць у аўтапрабегах. Тады былі папулярныя розныя турыстычныя вандроўкі — пешшу альбо на роварах, сплавы на байдарках. Генрых Адамавіч увайшоў у групу матацыклістаў.

— Гэта быў канец 70-х — пачатак 80-х гадоў. Тады яшчэ не было такога слова — «байкер». Але мы таксама вандравалі. Збіраліся групы маладых хлопцаў па 10-12 чалавек. Ездзілі па маршрутах мінулай вайны — у Брэсцкую крэпасць, Хатынь, Мінск. Выязджалі на Дзень Перамогі. Праўда, не так яскрава, як ездзяць байкеры цяпер, але таксама было даволі відовішчна, — успамінае суразмоўца.

Такія паходы доўжыліся ад некалькіх дзён да тыдня. Бралі з сабой палаткі. Пасля прабегу група атрымлівала турыстычную катэгорыю ў залежнасці ад кіламетражу. Прычым такі мотапрабег праходзіў арганізавана, а вось тэхніка была ў кожнага свая, у асноўным ездзілі на «Явах». Па словах Генрыха Адамавіча, асабістых працяглых вандровак было мала, ехаць на мора, напрыклад, было нязручна. Звычайна ездзілі па «беларускім коле».

— Цяпер байкеры ездзяць на крутой тэхніцы, у мяне такой няма. І я не ставіў сабе мэту набыць такі байк. У мяне іншае захапленне — сабраць калекцыю матацыклаў, што выпускалі савецкія заводы, на якіх ездзіла наша насельніцтва і якія «працавалі» на гаспадарку, — гаворыць Генрых Дзітко і расчыняе дзверы свайго гаража.

### АД «УРАЛА» ДА «МУРАШКІ»

Здаецца, што ў памяшканні безліч матацыклаў. На самай справе іх каля трыццаці. А ўражанне масавасці ствараюць матацыклы з калясками, і такіх тут нямала. Вось, напрыклад, магутны «Урал». Іх выпускаў расійскі завод «Ірбіт». Завод існуе і цяпер, але выпускае ў асноўным дарагія матацыклы, якія ідуць на экспарт, тлумачыць калекцыянер. У яго ёсць два «Уралы». Даволі ўмяшчальная каляска — тут спакойна могуць сесці два чалавекі. Такі матацыкл быў вельмі зручны ў гаспадарцы. У калясках вазілі і збожжа, і бульбу, і дровы... Яшчэ адным памочнікам быў матацыкл «Мурашка». Яго выпусцілі тульскія вытворцы. І хоць гэта быў лёгкі мотаролер, ён мог перавозіць да 250 кілаграмаў грузу ў прычэпе.

А вось чорны «Днепр». Іх выпускаў кіеўскі завод. Тут сабраныя матацыклы, якія выпускалі заводы ў савецкі час і краінамі СЭУ — Польшчы, Германіі, Венгрыі, Чэхаславакіі. Напрыклад, венгерскі чорны матацыкл Pannanonia Генрых Дзітко набыў адным з першых. Праўда, каляску асобна. Паасобку купіў і «Яву» з каляскай. На той час гэта быў адзін з самых хуткасных матацыклаў. А вось самымі папулярнымі ў насельніцтва былі «Іж» і «Днепр». «Іж-49» — адзін з першых экзэмпляраў калекцыі і самы «ўзроставы». У масавую вытворчасць Іжэўскі завод запусціў гэту тэхніку ў 70-я гады, але ў вясковым гаражы знаходзіцца экзэмпляр сярэдзіны 50-х. Калекцыянер звяртае ўвагу, што матацыкл па форме нагадвае японскую «Хонду». А вось прызначэнне матацыклы збольшага мелі практычнае. Прамысловасць была скіравана на тое, каб мадыфікаваць тэхніку пад патрэбы гаспадаркі.



— Вось гэты сіні «Іж» з каляскай дастаўся, можна сказаць, у спадчыну. Яго мы з братам купілі, калі я прыйшоў з арміі. Тады мы з ім паехалі на рынак і набылі для бацькі ў вёску гэты матацыкл. І столькі на ім усяго перавезлі! Ён доўга працаваў, а цяпер на «заслужаным адпачынку», — усміхаецца суразмоўнік.

Пазней удалося набыць матацыкл «Іж» — «Планета-5». Гэта адзін з апошніх матацыклаў Іжэўскага завода, але яго прадавалі без каляскі, замест яе — дошкі. На гэтай платформе, відаць, вазілі грузы.

— Тады менш было машын, а вяскоўцы набывалі ў асноўным матацыклы. І па сельскіх дарогах на іх зручней ездзіць, і па цане даступныя. Калі аўтамабіль каштаваў пяць тысяч рублёў, матацыкл — 400-500 рублёў. І на дачы потым сталі ездзіць, — распавядае Генрых Дзітко.

У калекцыі прадстаўлены матацыклы ўральскага, кіеўскага, тульскага, серпухоўскага, каўроўскага, іжэўскага заводаў. З беларускіх — два віды матацыклаў «Мінск», а ўсяго тут выпускалі дзесяць відаў. Дарэчы, у Гродне была зладжана вытворчасць матацыклаў «Нёман». Гэта былі лёгкія мотаролеры, і іх было няшмат.

Мясцовы калекцыянер марыць сабраць поўныя лінейкі розных мадэляў савецкіх матацыклаў. Некаторыя мадэлі набыць цяжка з-за іх абмежаванага выпуску і дарагога кошту. Між тым калекцыя папаўняецца. Летась Генрых Адамавіч купіў яшчэ адзін «Іж» і «Яву» — менавіта тых мадэляў, якіх не было.

### «ГЭТА НЕ ПРОСТА ЖАЛЕЗА...»

Многія экспанаты набываліся ў даволі дрэнным стане. Большасць з іх стаяла ў прыбудовах ці проста на падворках. Вядома, пры эксплуатацыі яны выглядалі не так, а калі гаспадары пераселі на машыны, матацыклы аказаліся непатрэбныя. Таму амаль усе прыйшлося абнаўляць: рамантаваць, фарбаваць. У гэтай справе калекцыянеру дапамагае і жонка. На трэці экспанатаў калекцыі пры жаданні можа ездзіць. Аднак Генрых Адамавіч не спяшаецца даць ім другое жыццё. Абслугоўванне такой тэхнікі патрабуе значных затрат, да таго ж, у калекцыянера іншая мэта. Ён імкнецца паказаць моладзі тэхнічную спадчыну савецкага перыяду, тых часоў, калі матацыклы былі памочнікамі ў гаспадарцы, працаўнікамі, сябрамі.

— Гэта не проста жалеза. Над стварэннем гэтай тэхнікі працавалі нашы бацькі і дзяды, але, на жаль, яна знікае, таму яе хочацца захаваць. Каб моладзь убачыла гэтых тэхнічных памочнікаў, бо цяпер матацыклы робяць больш для моладзі, для вандровак, для хуткасці, — тлумачыць калекцыянер. І нагадвае, што гэта хобі для душы.

Хобі, як вядома, не абыходзіцца без затрат. Наколькі гэта накладна? Генрых Дзітко не лічыць, што занадта дорага. Канешне, кожны экспанат чаго-кольвек каштуе. Але калекцыя збіралася не год-два, а цэлую чвэрць стагоддзя. Многія экспанаты былі ў такім стане, што гаспадары з радасцю аддавалі іх за 100-150 долараў.

### А ЯК НАКОНТ МУЗЕЯ?

Прызнацца, гэтае пытанне не магло не цікавіць. Здаецца, для прыватнага музея ёсць усе ўмовы. Па-першае, даволі прасторны і з густам абсталяваны «ангар». Тут нават падлога з дрэва, як у аграсядзібах, ды і само памяшканне ў такім жа стылі. Па-другое, наяўнасць унікальных экспанатаў. Ды і цікаўнасць да гэтай тэхнікі ёсць. Сюды прыходзяць на экскурсію школьнікі, нават прыязджаюць з іншых гарадоў. Вядома, цікавяцца байкеры.

Генрых Дзітко ведае, што музей матацыклаў ёсць, напрыклад, у польскім Беластоку. У нас такіх музеяў, відаць, пакуль няма. Хоць асобныя калекцыянеры, канешне, ёсць. Некаторыя займаюцца рэканструкцыяй рэтраматацыклаў, якія выпускаліся ў 30-я гады. У Мінску нават праводзіцца адпаведны фестываль.

За музейную справу Генрых Дзітко ўзяцца пакуль не гатовы. І час на гэта патрэбны, і фармальнасцяў шмат... Да таго ж калекцыянер сумняваецца, ці будзе гэта цікава шырокаму колу людзей. Маўляў, спецыфічныя экспанаты. Ды і турызм на мясцовым узроўні не вельмі развіты.

І ўсё ж, здаецца, для аграгарадка такі музей можа быць даволі прэстыжным аб'ектам. Парэчча знаходзіцца на добрым транзітным шляху, тут працуе санаторый, ёсць нямала турыстычных баз. Людзі маглі б зацікавіцца тэхнікай, якая, магчыма, была ў іх сем'ях. Моладзь атрымае магчымасць параўнаць тое, што было раней, з сучаснай тэхнікай. Бо дзе яшчэ ў нас можна ўбачыць столькі рэдкіх экзэмпляраў матацыклаў у адным месцы?..



**У тэму**

У Гродзенскім раённым культурна-інфармацыйным цэнтры паведамілі, што прыватных музеяў у раёне няма. А вось у Гродне іх два. Абодва прадстаўляюць прадметы хатняй гаспадаркі. Уласнік музея прасаў расказаў, што ён аформіў сваю ўстанову як індывідуальны прадпрымальнік, плаціць падаткі ў 5 % з абарачэння. Перад упраўленнем культуры ніякай справаздачы не мае. Затое ёсць дамоўленасць з 15-ю дзяржаўнымі арганізацыямі. І хоць праект камерцыйны, як кажуць у музеі, ён трымаецца ў асноўным на энтузіязме.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# Да юбілеяў — і музейныя здабыткі

## 100 гадоў таму Якуб КОЛАС вярнуўся ў родную Беларусь з Куршчыны

**2021 год з'яўляецца знакавым для Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. У 1921 годзе паэт разам з сям'ёй вярнуўся з Куршчыны (Расія), дзе быў у эвакуацыі падчас Першай сусветнай вайны.**

— Пагадзіцеся, што ўнёсак народнага песняра ў развіццё беларускай мовы і літаратуры, навукі, нацыянальнай культуры каласальны, — дзеліцца сваімі разважаннямі **дырэктар музея Аляксандр ХРАМЫ.** — І цяжка ўявіць, што б наша Бацькаўшчына страціла, калі б пісьменнік застаўся на чужыне. Прыемна, што ўжо ў студзені мы пачынаем рэалізоўваць цэлую праграму з самых розных мерапрыемстваў. Па-першае, 14 студзеня правядзём прэзентацыю кніг Якуба Коласа, якія выдалі намаганнямі музея ў апошні час, — а гэта паэмы «Міхасёвы прыгоды», «Раквусач», кніга вершаў, адрасаваных дзецям. Па-другое, ў музеі была адкрыта выстаўка графічных твораў таленавітай мастачкі Алесі Жыткевіч да 85-годдзя з дня выхаду ў друк паэмы «Міхасёвы прыгоды». Дарэчы, гэтыя работы сталі ілюстрацыямі да кніг, якія мы толькі што выдалі. Спадарыня Алеся прыняла рашэнне падарыць сваю кніжную графіку ў фонды музея.

Яшчэ адзін юбілей — 95 гадоў з дня нараджэння малодшага сына песняра, Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, — 31 студзеня 2021 года. І гэтая дата таксама будзе адзначана ў музеі. Так супала, між іншым, што ў самым пачатку сёлетняга студзеня ў зборы Коласаўскага музея ўнучка паэта Вера Данілаўна Міцкевіч перадала «Міхасёвы прыгоды» 1935 года выдання з аўтографам беларускага класіка вядомаму рускаму пісьменніку-марыністу, аўтару «Цусімы» Аляксею Сілічу Новікаву-Прыбою. Вера Данілаўна ў свой час атрымала кнігу ад родных рускага празаіка. Дарэчы, паэма — 94-е па ліку выданне з коласаўскім аўтографам у зборах музея.

— Запрашаем усіх цікаўных да жыцця і творчасці Коласа ў наш музей, — гаворыць Аляксандр Храмы, — 14 студзеня а 12-й гадзіне. Нагадваем наш адрас: Мінск, вуліца Акадэмічная, 5.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ЗАСТУПНІЦА СТАЛІЦЫ

**Гэта не проста адзін з самых старых беларускіх артэфактаў, гэта аб'ект, якому ўжо больш за 500 гадоў пакланяюцца жыхары Мінска. З ім звязаны легенды і рэальныя гістарычныя падзеі. За яго змагаліся, спрачаліся, хваляваліся. Не ўсе тайны абраза Божай Маці Мінскай яшчэ разгаданыя. Крыху пазнаёміліся з імі і разам з гісторыкам і экскурсаводам Цімафеем Акудовічам «адправімся» ў адмысловую вандроўку, прысвечаную галоўнай святыні Мінска.**

Легенда пра з'яўленне абраза Божай Маці Мінскай вядомая з некалькіх крыніц. Адна з найбольш грунтоўных — у работах манаха-базыльянца з Полацка Ігнація Сцябельскага. Так, у 1781 годзе ён пісаў, што абраз спачатку знаходзіўся ў Кіеве ў Дзесяціннай царкве, «будучы пастаўлены там святым самадзержцам зямель рускіх Уладзімірам Першым Святаслававічам, дзе заставаўся на працягу пяціста з гакам гадоў». Але каля 1500 года падчас рабаўніцтва Кіева татарамі адзін з іх вынес абраз з царквы, садраў з яго рызу і кінуў у Дняпро. Так абраз ці то вадой (цудоўным чынам супраць плыні), ці то анёламі быў перанесены да Мінска і з'явіўся на рацэ Свіслач пад замкам, дзе быў заўважаны па незвычайным ззянні.

Самае цікавае, што амаль усё супадае з рэальнымі гістарычнымі падзеямі. У канцы XV стагоддзя крымскія татары сапраўды рабавалі Кіеў, а сам горад стаіць на Дняпры, куды «басурмане» маглі кінуць абраз. Ёсць, праўда, і «нестыкоўка» — Дзесяцінная царква (адзін з сімвалаў Кіева) на той момант ужо была разбураная.

У іншым апісанні гэтай легенды згадваецца, што абраз быў намаляваны святым Лукой. Наогул у той час усе найбольш значныя святыні прыпісвалі гэтаму апосталу. На Русі было вядома дзесяць такіх абразоў, сярод якіх і згаданы намі.

Сёння на ўзбярэжжы Свіслачы, побач з адным з карпусоў Мінскай духоўнай акадэміі, стаіць скульптура ў гонар з'яўлення абраза Божай Маці — можа быць, якраз побач з тым месцам, адкуль яго дасталі з вады. Але ад гэтай цудоўнай кампазіцыі давайце пяройдзем на другі бок вуліцы Максіма Багдановіча, дзе некалі знаходзілася Мінскае замчышча.

## ШАНАВАННЕ СВЯТЫНІ

Ікона была перанесена да замка, што стаяў за высокімі валамі (каля дзесяці метраў). У XVI стагоддзі тут віравала жыццё. За імі былі тры царквы, у адной з якіх і захоўваўся абраз Божай Маці Мінскай. Ёсць сведчанне з канца XVI стагоддзя, што побач з гэтай выявай Божай Маці былі ўпрыгажэнні і каштоўныя ланцужкі, якія насілі багатыя і паважаныя людзі. Калі абразу рабілі такія ахвяраванні, значыць, яго вельмі шанавалі. Яшчэ адно з пацвярджэнняў таму — пры царкве было брацтва не ў гонар храма, а менавіта святыні, якая там захоўвалася.

Але чаму абраз быў такі шанаваны? Магчыма, падказка схаваная ў «Атласе Святой Марыі». У 1670-х гадах падобныя выданні ў Еўропе былі даволі папулярныя, у іх апісваліся абразы, з якімі былі звязаныя пэўныя цуды. У адным з такіх распавядалася і пра святыню з Мінска. Прычым, акрамя «класічных» цудаў, такіх як вылячэнне сляпых і звар'яцелых людзей, згадваецца, што пасля таго як абразом абнеслі горад, удалося спыніць эпідэмію. Прыводзіцца тут і вялікая перамога над татарамі, якую ўдалося здабыць у прысутнасці гэтага абраза.

У пачатку XVI стагоддзя татары спальвалі Мінск некалькі разоў, якраз у часы з'яўлення іконы. Але ў 1506 годзе ў бітве пад Клецкам пад кіраўніцтвам князя Глінскага татараў удалося разбіць. Перамога над ворагам, які доўгія гады тэрарызаваў землі Вялікага Княства Літоўскага, канешне, была важнай падзеяй. Хутчэй за ўсё, менавіта ў гэтай бітве быў «задзейнічаны» і цудадзейны абраз, бо ў ёй удзельнічалі і мінскія харугвы. Натуральна, што перамогу звязвалі з дапамогай святыні.

## ПАД ЦІСКАМ УНІІ

Давайце пяройдзем да самага старога будынка ў сталіцы — Петрапаўлаўскай царквы. Тут абраз Божай Маці захоўваўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у храм ён быў унесены ў 1942 годзе (на той час гэта была адзіная адчыненая праваслаўная царква ў цэнтры). І хоць святары спрабавалі прыцягнуць сюды вернікаў, дзейнічалі курсы і школа, людзі ўсё ж не ішлі. Баяліся. За брамай царквы пачыналася Мінскае гета, адкуль чуліся стрэлы і крыкі, дзе гінулі людзі. Пасля вайны храм зачыніўся, у будынку стварылі архіў, а святыня з 1945 года была перанесена ў кафедральны сабор.



Але тут варта згадаць не толькі ваенную гісторыю. Петрапаўлаўская царква была пабудавана ў 1612 годзе дзякуючы ахвяраванням апошніх буйных праваслаўных родаў (у той час шляхта масава пераходзіла ў каталіцызм). Ахвяруючы сродкі на будоўлю, шляхта пакінула наказ, што робіць гэта, каб іх дзеці засталіся праваслаўнымі. Сёння на храме ёсць шыльда ў гонар заснавальнікаў Свята-Петрапаўлаўскага манастыра. Сярод пазначаных прозвішчаў — Друцкія-Горскія, Агінскія, Ванькавічы, Валадковічы, Станькевічы, Вярыгі, Сялявы. Наказ не быў выкананы — іх нашчадкі ўжо будуць каталікамі.



Варта звярнуць увагу яшчэ на адно прозвішча з гэтай шыльды — Рагозаў. Менавіта рашэнне, прынятае прадстаўніком гэтага роду Міхаілам, значна паўплывала на далейшы лёс Божай Маці Мінскай.

Міхаіл Рагоза стаў мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. У 1596 годзе ён падпісаў Берасцейскую унію, тым самым прызнаўшы далучэнне праваслаўных епархій да рымска-каталіцкай царквы. Гараджане такое рашэнне не падтрымалі, успрыняўшы яго як здрадніцтва веры.

Большасць мінчан перастала наведваць галоўныя храмы, і дайшло да таго, што людзі ахвяравалі грошы ў магістрат, каб адтуль яны ішлі на маленькую цэркаўку, апошнюю праваслаўную ў горадзе.

Адзінае, чаго дамогся мітрапаліт Рагоза, — вяртанне абраза Божай Маці. Яго размясцілі ў кафедральнай царкве.

## ПАДАРУНАК КАРАЛЕВЫ

Ёсць і іншыя версіі таго, як у Мінску з'явіўся цудадзейны абраз. Цімох Акудовіч прывёў версію, выказаную гісторыкам Юрыем Мікульскім, пра тое, што абраз быў падораны каралевай. У судовай цяжбе паміж мітрапалітам Міхаілам Рагозам і жыхарамі Мінска згадваецца, што гараджане забралі з храма каштоўныя ланцужкі, падсвечнікі і абраз, падораны каралевай Аленай.

Алена — дачка маскоўскага князя Васіля III, была жонкай Вялікага князя Літоўскага Аляксандра. Алена адмовілася станавіцца каталічкай, як патрабавала акружэнне Аляксандра. Нават падчас вяселля, якое праходзіла ў Вільні па каталіцкім абрадзе, за дзяўчынай стаяў праваслаўны святар.

Алена рабіла ахвяраванні на праваслаўе. Вядома, што ў Вільні захоўваўся абраз, падораны ёй. Некалькі разоў каралева наведвала Мінск, у тым ліку і ў пачатку XVI стагоддзя. І тут таксама пакінула каштоўныя падарункі.

## НОВЫ ДОМ

Пазбаўленыя вернікаў, уніяцкія цэрквы прыходзілі ў заняпад. Распаўсюджваць унію праз звычайных святароў было вельмі складана. Але ўсё змянілася, калі да справы былі далучаны манахі, якія шмат працавалі на асвету. Тут варта згадаць Язэпа Руцкага — стваральніка ордэна базыльянаў.

Тады і ўзнікла ідэя аб перанясенні абраза на новае месца — у Верхні горад, які ў пачатку XVII стагоддзя становіцца яго цэнтрам. Там пачаў будавацца Свята-Духаў храм. Не абышлося без спрэчак, прычым базыльяне пасварыліся са сваімі ж — уніятамі. Частка шляхты на той момант ужо прыняла унію і выступала за тое, каб абраз заставаўся ў старым Кафедральным саборы на Замку, а Язэп Руцкі быў упэўнены, што неабходна стварыць новы моцны цэнтр і шанаваная ікона павінна захоўвацца менавіта ў Верхнім горадзе. Гэтыя спрэчкі зацягнуліся, нават у XVIII стагоддзі уніяцкія жыхары горада судзіліся са Свята-Духавай царквой, каб абраз Божай Маці Мінскай вярнулі на Замак.

Не ўсе гараджане гатовыя былі мірыцца з тым, што ў цэнтры горада з'явіцца новы буйны ўніяцкі комплекс. Часам па начах яны «шчыравалі» на будоўлі царквы Святога Духа — раскідвалі, псавалі матэрыялы. Нават за тры дні да перанясення абраза быў здзейнены такі напад. І тым не менш, урачыста, вялікім хрэсным ходам абраз быў перанесены ў новы храм.

Абраз Божай Маці, відаць, спрыяў таму, што сюды пацягнуліся вернікі. Так, калі спачатку царква была драўляная, то каля 1636 года тут быў закладзены мураваны будынак. Свята-Духаў храм займеў унікальны барочны фасад, размаляваны фігурамі святых. Менавіта ў гэтай царкве абраз захоўваўся найбольш доўгі час — да 1935 года. Тут жа ён змяніўся. Вобраз, вядомы нам сёння, быў намаляваны па-над старым роспісам.

У пачатку XVIII стагоддзя падчас вайны са шведамі, калі ў Мінску спыняўся Пётр Першы, абраз і храм ніхто не чапаў. Адзінае, калі войскі Пятра сышлі, за рабаўніцтва ўзяліся калмыкі, што служылі рускаму цару. У тым ліку «пагаспадарылі» яны і ў храме Святога Духа, хацелі знесці абраз, але горад узняўся на абарону і адстаяў сваю святыню.

У XIX стагоддзі храм пацярпеў ад пажару. Пасля некалькіх перабудоў ён цалкам змяніў свае аблічча. Тады ж абраз быў перамаляваны на новы лад.

Царкву ў 1915 годзе наведаў Мікалай II, дзе яму паказалі і самы шанаваны абраз горада.

Храм Святога Духа быў узарваны ў 1936 годзе. Яго аднавілі ў 2009—2011 гадах, прычым у тым выглядзе, у якім ён быў пабудаваны ў XVII стагоддзі. Сёння тут знаходзіцца канцэртная зала Дзіцячай філармоніі «Верхні горад».

## ВЯРТАННЕ

У 1920-я гады на мінскую святыню паквапіліся новыя ўлады. Дакладна, іх больш цікавіла багатая аправа абраза Божай Маці. Гараджане паспрабавалі адкупіцца ад сквапных бальшавікоў. Але ў хуткім часе аправу ўсё роўна «прыбралі» на карысць рэвалюцыянераў. Абраз жа перадалі ў краязнаўчы музей.

За савецкім часам Мінскі дзяржаўны музей размяшчаўся ў Архіерэйскім падворку — на месцы цяперашняга Дома афіцэраў. Музей гэты быў даволі багаты. Так, у ім меліся экспазіцыі, прысвечаныя першабытнаму часу і Сярэднявеччу. Дарэчы, артэфакты для яго збіраў Вацлаў Ластоўскі.

У 1930-х гадах, калі пачалося будаўніцтва Дома афіцэраў, музей перамясціўся ў флігель, у якім было мала месца для экспазіцый. Новыя куратары палічылі ранейшую экспазіцыю «буржуазнай». Пад ранейшую гісторыю выдзелілі адну залу, астатнія прысвяцілі рэвалюцыі.

Вялізная колькасць артэфактаў трапіла ў дрывотню. Ёсць апісанне, што абразы проста скінулі на зямлю. І калі б нейкі чалавек не пасцяліў палатно, не прыставіў іх да сценкі і не прыкрыў, магчыма, снегам і дажджом каштоўнасці былі б знішчаны.

Пры немцах у Мінску новы кіраўнік музея знайшоў абраз і перадаў яго на рэстаўрацыю Георгію Віеру...

Пасля вайны абраз быў перанесены ў Свята-Духаў кафедральны сабор, дзе і знаходзіцца сёння.

У пачатку 1990-х рэстаўратару Пятру Журбею выпала складаная задача па аднаўленні святыні... Сёння абраз Божай Маці такі, які ён быў у XVII стагоддзі, а пад гэтым слоем схаваныя яшчэ больш старажытныя лікі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Прывіды беларускіх муроў

# КНЯЗЁЎНА СОНЕЧКА АЛЬБО АТРУЧВАЛЬНІЦА НАВІЦКАЯ?

**Вядома, у вандроўцы па містычных мясцінах Беларусі нельга абысці Мірскі замак... Сам выгляд ягоных магутных сцен з чорнымі вачніцамі байніц і чырванню цэглы ўспрымаецца як фон для здымак касцюміраваных фільмаў, з мячамі, шаблямі, стрэламі гармат... Дарэчы, для мяне так і стала — у Мірскім замку здымалі многія сцэны фільма па кнізе «Авантуры Пранціша Вырвіча» майго аўтарства, і менавіта па гэтым брукаваным дворыку ездзіла створаная на «Беларусьфільме» Жалезная Чарапаха — танк на паравым рухавіку па эскізах Леанарда да Вінчы. Тут па сігнале рэжысёра ўзрываліся ядры, стукаліся клінок аб клінок... А ўночы, у святле пражэктараў, па канаце, працягнутым высока над брукаванкай, ад акна да акна, караскаўся юны шляхціц Пранціш Вырвіч, выкрадаючы паланянку — прыгажуню Саламею Рэніч...**





## ПРАКЛЯТАЕ ВОЗЕРА

Вядома, кожнаму экскурсанту, які прыязджае сюды, расказваюць легенды пра мясцовых прывідаў. Абавязкова пакажуць на возера — яго, маўляў, загадаў выкапаць адзін з уладальнікаў замка, Мікалай Святаполк-Мірскі, а для гэтага давялося знішчыць квітнеючы сад, пасаджаны ранейшым арандатарам, Пуцятам...

Высякаць дрэвы ў квецені — грэх і дрэнная прыкмета... Сяляне адмаўляліся... Але сад усё ж быў знішчаны, і праклён лёг на створаны на тым месцы маляўнічы вадаём. Кожны год возера забірае ахвяр, і патануць у ім нібыта мусіць столькі людзей, колькі квітнеючых дрэў было ссечана. І адной з першых яго ахвяр аказалася дванаццацігадовая князёўна Сонечка. Яе пахавалі ў прыгожай капліцы, а паколькі капліцу ўвесь час затаплялі воды і рабавалі грабежнікі, дух Сонечкі паказваецца ў выглядзе Белай Дамы ў адной з вежаў замка.

Звычайна ў аповедах экскурсаводаў і шматлікіх «містычных» артыкулах у сеціве можна заўважыць некаторыя нестыкоўкі. Часта Сонечку называюць дачкой Мікалая Святаполк-Мірскага, радзей — унучкай. Сустракала і азначэнне «ўладальніца замка», што з прычыны дванаццацігадовага ўзросту князёўны выглядае дужа сумніўна.

Што ж хаваецца за легендай, якія гістарычныя факты?



## ХТО ТАКАЯ СОНЕЧКА?

Адразу скажу, што ў Мікалая Святаполк-Мірскага дачок не было, у радаводзе значацца сем сыноў. І яшчэ адзначу, што род Святаполк-Мірскіх да Мірскага замка да канца XIX стагоддзя дачынення не меў, хоць і мае беларускія шляхецкія карані. Проста генерал ад кавалерыі, вайсковы наказны атаман Войска Данскога Мікалай Святаполк-Мірскі з задавальненнем скарыстаўся магчымасцю набыць замак, які можна выдаць за ўласны маярат з прычыны супадзення прозвішча. Замак прадала княгіня Марыя Гагенлоэ-Шылінфюрст, якой ён дастаўся ў спадчыну ад брата, Пятра Вітгенштэйна, а той атрымаў замак ад сына Льва, а апошняму замак дастаўся ад жонкі, Стафаніі Радзівіл.

Затое ў аднаго з сыноў Мікалая Святаполк-Мірскага, Івана, сапраўды была дачка Сонечка, якая памерла ў 12-гадовым узросце. У аповедзе расійскай пісьменніцы Наталлі Рамодзінай так апісваецца гасцяванне ў Мірскім замку: «У гаспадароў замка нядаўна скончылася жалоба: маладая жонка другога сына старога князя, Варвара Міхайлаўна, хуткім чынам памерла, пакінуўшы сіратой гадавалую дачку з дзіўным імем Кіра. Усе ў маёнтку ведалі, што з прыўкраснай палячкай Іван павянчаўся таемна, знаходзячыся ў Варшаве, а родныя не прызналі гэтага шлюбу. Іван быў яшчэ занадта малады для сямейнага жыцця. Несуцешны ўдавец, Іван Мікалаевіч, 25 гадоў ад нараджэння, вінаваціў свайго бацьку ў тым, што той шэсць гадоў таму загадаў высечы шыкоўны яблыневы сад у квецені. Паводле падання, ссячы квітнеючае дрэва — значыць загубіць бязвінную душу. Па маёнтку хадзілі чуткі, што нібыта Мікалаю Іванавічу з'явілася адна з даўно памерлых (не сваёй смерцю) насельніц Мірскага замка і прадказала, што кожны год у маёнтку будуць ахвяры.

Варвара Міхайлаўна, лічыў Іван Мікалаевіч, стала адной з такіх ахвяр. Але гучна заяўляць пра тое бацьку — гэта сярод дваран лічылася «не камільфо», таму Іван Святаполк-Мірскі сычэў скрозь зубы, паглядаючы спадылба».

Не ведаю, якая тут доля аўтарскай фантазіі, але Іван Святаполк-Мірскі сапраўды рана ажаніўся, таемна павянчаўшыся ў Варшаве з чытальніцай адной старой княгіні, то-бок фактычна служанкай, прыгажуняй Барбарай Рудавай. Іх дачка Кіра пражыла доўгае жыццё, яна памерла ў 1968 годзе, пакінуўшы нашчадкаў. Барбара памерла ў Варшаве хутка пасля нараджэння дачкі, таму невядома, ці лічыў Іван датычным да яе смерці праклён Мірскага замка. Тым больш што праз чатыры гады пасля смерці Барбары ён, афіцэр кавалерыі, ажаніўся ў Новачаркаску з Надзеяй Васілеўнай Энгельгард. Відавочна, што гэта сваячка ягонай бабулі па маці Соф'і Энгельгард. Жылі яны ў сваім маёнтку пад Жытомірам, прыязджалі ў Мір гасцяваць... Менавіта там, у Жытоміры, нарадзілася з іх пяцёра дзяцей, старэйшае — Сонечка. Год яе нараджэння — 1901, год смерці — 1913. Яе астанкі і сапраўды ў капліцы Мірскага замка, якую па загадзе бабулі Сонечкі, Клеапатры Міхайлаўны, пабудавалі ў 1910-м.

Захаваліся дакументы, якія сведчаць аб тым, што Соф'я Святаполк-Мірская была пахаваная ў гэтай капліцы 3 мая 1913 года. Няўжо князёўна і праўда патанула ў возеры каля сцен Мірскага замка? Але дакументы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі пра яе пахаванне сведчаць, што дзяўчынка патанула ў Балгарыі — напэўна, сям'я знаходзілася там на адпачынку. Труну прывезлі на станцыю Замір'е, дзе правялі паніхіду святар Хлябцэвіч і дыякан Занцэвіч, потым жалобная працэсія адправілася ў Мір, дзе маленькая нябожчыца спачыла ў радавым склепе.

Вядома, варта яшчэ пераправерыць, але, падобна, князёўна сапраўды патанула, хоць і далёка ад дому...

Дарэчы, шлюб Івана і Надзеі Энгельгард распаўся, яны развяліся ў 1915-м, Іван пераехаў у Мір.

На праклён спісвалі і смерць Клеапатры Міхайлаўны — яна лягла ў збудаваную ёю капліцу ў 1910-м, і самога Мікалая Святаполк-Мірскага, які памёр яшчэ ў 1898-м. Хаця ягоных 65 гадоў на той час — узрост дастаткова паважны, каб не лічыць смерць заўчаснай. Астанкі чалавека, які ссек яблыневы сад, таксама былі перапахаваныя ў капліцы.

Дык ці праўда па Мірскім замку блукае прывід маленькай князёўны Сонечкі?

Мне здаецца, каб адшукаць падставу змрочнай легенды, варта паглыбіцца далей у часе, да першых уладальнікаў і будаўнікоў замка, Іллінічаў.

## НЯДРУЖНАЯ СЯМЕЙКА ІЛЛІНІЧАЎ

Замак абавязаны свайму з'яўленню Юрыю Іванавічу Іллінічу.

Кажуць, менавіта яго і ягоных чатырох сыноў сімвалізуюць магутныя замкавыя вежы.

Сустрэла дзіўную версію, нібыта на будаўніцтве замка настаяла жонка старэйшага сына Юрыя Ілініча Івана, дачка князя Слуцкага Ганна, у якую нібыта быў закаханы ейны свёкар. Тая міфічная Ганна Слуцкая мела княжацкія амбіцыі, а для таго, каб сям'я Іллінічаў, часткай якой яна стала, таксама магла прэтэндаваць на статус княжацкай, патрэбны быў замак.

Думаецца, каханне да нявесткі — домысел, Юрый Ілініч і сам спаў і сніў сябе князем. Таму і ўклаў усе запасы ў будаўніцтва замка, у тым ліку дадзеныя яму каралём Жыгімонтам «10 тысяч залатых вугорскіх чырвоных» памерлага падскарбія Аўрама Езафовіча.

Зрэшты, справа з тымі дукатамі дужа заблытаная — ці то пазыка была, ці нахабнае прысвойванне...

Але дакладна ў гісторыі зафіксавана, што адносіны Юрыя Ілініча з сынамі былі вельмі напружаныя. Прынамсі, калі ён паміраў, завяшчаў распараджацца сваёй маёмасцю «экзекутарам», даверaным асобам. А сыны маглі скарыстацца спадчынай толькі пасля таго, як выплацяць свае даўгі. Старэйшы сын Іван, у жонку якога нібыта быў закаханы Юрый, увогуле быў пазбаўлены спадчыны, «иж он мне отцю своему жалости и прикрости великие чинил».

Пасля смерці Юрыя сыны так апантана пачалі біцца за ягоныя багацці, што... забыліся пахаваць бацьку. У шляхты, дарэчы, доўгія пахаванні былі справай звычайнай, цела нябожчыка бальзамавалі і ўчынялі працяглыя пышныя провады... Вялікага гетмана Радзівіла Рыбаньку сын, Пане Каханку, гэтак хаваў цэлы год, поячы-кормячы цэлае княства. Але тут справа была іншая. Давялося ўмешвацца каралю, каб прымусіць спадчыннічкаў успомніць пра абавязкі сыноўскія.

## ВЯДЗЬМАРКА НАВІЦКАЯ

Другі сын, Мікалай, памёр у наступны год пасля смерці бацькі. І ўладальнікам замка зрабіўся сярэдні сын, Станіслаў. Чатыры гады ён валодаў замкам, а потым быў атручаны проста за бяседным сталом. У некаторых крыніцах гаворыцца, што гэта было ягонае вяселле. За следства ўзяліся старэйшы брат Іван і малодшы, Шчасны. Хутка знайшлі і вінаватага: жонку сотніка па прозвішчы Навіцкая. Нібыта яна раней знаходзілася ў свіце жонкі Івана.

Каб усё было праўдападобна, няшчасную Навіцкую абвінавацілі ў вядзьмарстве. Здабылі і прызнанне: «Без жадного караньня, сама вызнала, иж она з направы некоторых неприятелей своих трутизну п(а)ну Станиславу дала, якъ он у ихъ дому на учсте был...»

Чула жаласлівую гісторыю, што Навіцкая была закаханая ў князя Станіслава, які стаў яе палюбоўнікам... А магчыма, ён яе згвалціў, і яна адпомсціла. Але, думаю, сапраўднасць больш празаічная — грошы і змаганне за маёмасць «некоторых непрiятелей», і ці не братоў шчаслівага ўладальніка замка?.. На патрабаванні Івана і Шчаснага «ведзьму» Навіцкую Навагрудскі трыбунал асудзіў да спалення на вогнішчы, што надзвычай рэдка практыкавалася ў Вялікім княстве Літоўскім.

Дарэчы, пасля пакарання Навіцкай Фелікс Шчасны атрымаў ва ўладанне замак, а старэйшаму брату, Івану, кароль вярнуў правa на спадчыну, і той забраў іншыя уладанні. Гісторык Андрэй Янушкевіч, які даследваў гэтую гісторыю, дадае: «Страціўшы жонку, Навіцкі патрабаваў ад гаспадара спагнаць са Шчаснага Юр'евіча Ілініча галоўшчыну, аднак Жыгімонт Стары 28 кастрычніка 1533 г. таго цалкам апраўдаў».

У Шчаснага, які сканцэнтраваў у сваіх руках усё багацце роду, быў адзіны сын. Ён памёр бяздзетным, пакінуўшы Мірскі замак стрыечнаму брату Радзівілу Сіротку.

Прывід спаленай Навіцкай можа блукаць па галерэях Мірскага замка ці, напрыклад, лётаць у выглядзе белага голуба... А Сонечка Святаполк-Мірская? Што ж, фантазію абмяжоўваць немагчыма, а муры старажытнага замка здольныя змясціць шмат, вельмі шмат легендаў, паданняў і... зданяў.



**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Повторный открытый аукцион № 10/20 по продаже административных помещений в Минске и Новополоцке

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Реалконсалтинг»,** **адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс + 375 (17) 256-61-35** | | | |
| **Аукцион состоится 28.01.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)** | | | | |
| **№ лота** | **Предмет аукциона** | **Местонахождение** | **Начальная цена продажи лота в белорусских рублях, с учетом НДС** | **Сумма задатка по лоту, руб.** |
| **1** | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-701892, площадью **92,7 кв. м.** Назначение: **помещение финансового назначения** | **г. Минск, пр-т Независимости, 29-1Н** | **424 805 руб. 29 коп.** | 20 000 |
| **2** | Изолированное помещение с инвентарным номером 252/D-74, площадью **1594,4 кв. м.** Назначение: **помещение финансового назначения** | **Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, 92А-3** | **2 228 210 руб. 40 коп.** | 40 000 |
| **3** | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7054974, площадью **222,1 кв. м.** Назначение: **помещение финансового назначения** | **г. Минск, ул. К. Цеткин, 51-2** | **1 013 213 руб. 92 коп.** | 20 000 |
| **Порядок проведения и выбора победителя** | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае, когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия | | | |
| **Прием заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 25.01.2021 до 17.00** | | | |
| **Задаток** | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>- для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>- для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении повторного аукциона № 10/20 по лоту №___» | | | |
| **Затраты** | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения повторного аукциона № 10/20. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения | | | |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:**
+ 375 (17) 256-61-35 • + 375 (25) 549-86-22, Игорь Садливский, auction@expertiza.by. Подробная информация у нас на сайте: **http://www.expertiza.by**
*Извещение о первом аукционе было опубликовано в газете «Звязда» от 27.11.20*

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **Совместное общество с ограниченной ответственностью «Центральная продовольственная компания» (СООО «ЦПК»)** УНП 690576472, дело № 118-11Б/2020 Экономический суд г. Минска, в лице антикризисного управляющего ИП Колотиловой Т.А., тел. +375 (29) 550-94-84.

Первые повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **27 января 2021 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY

| № п/п | Лот № | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 13176 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA-02», рег. знак. АК 6274-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049143 X96330900B1001229, цвет – белый | 7 000,00 | 6 650,00 |
| 2 | 13177 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA-02», рег. знак. АК 6273-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049145 X96330900B0999016, цвет – белый | 7 000,00 | 6 650,00 |
| 3 | 13178 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA-02», рег. знак. АК 9996-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049115 330900B0995742, цвет – белый | 5 200,00 | 4 940,00 |
| 4 | 13179 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA-02», рег. знак. АК 3360-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049125 330900B0998233, цвет – белый | 6 100,00 | 5 795,00 |
| 5 | 13180 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак. АМ 3270-5, 2012 г. в., кузов (рама) № Y3H473800C0062721 X96330900C1023587, цвет – белый | 7 900,00 | 7 505,00 |
| 6 | 13181 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак. АМ 3271-5, 2012 г. в., кузов (рама) № Y3H473800C0062795 X96330900C1023568, цвет – белый | 7 900,00 | 7 505,00 |
| 7 | 13182 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 «BELAVA», рег. знак. АМ 8987-5, 2013 г. в., кузов (рама) № 330900D1033192 Y39330900D0106089, цвет – белый | 7 900,00 | 7 505,00 |
| 8 | 13183 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA», рег. знак. АМ 9089-5, 2013 г. в., кузов (рама) № Y39330900D0106088 330900D1033264, цвет – белый | 7 900,00 | 7 505,00 |
| 9 | 13184 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак. АН 8793-5, 2013 г. в.,кузов (рама) № Y39330900D0106065 X96330900C1026126, цвет – белый | 7 900,00 | 7 505,00 |
| 10 | 13189 | Седельный тягач Renault Premium 410, рег. знак. АО 2767-5, 2008 г. в., кузов (рама) № VF624GPA000015144, цвет – белый | 31 000,00 | 29 450,00 |
